

ЧАМУ ЗІМОЙ ХОЧАЦЦА ШАКАЛАДУ? 10



У ЧЫМ САКРЭТ МАЛОЙ РАДЗІМЫ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 СТУДЗЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 14 (29894)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Прайшло ўжо больш за тры месяцы з моманту ўводу механізму добраахвотнай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы (па так званай формуле тры плюс тры). На сёння ўжо заключана 11 тысяч дагавораў па гэтай праграме. У лідарах жанчыны. Больш за ўсё гэтай праграмай скарысталіся ў Мінску і Мінскай вобласці. Што да перыяду выплат, то ён можа быць на працягу 5 ці 10 гадоў пасля выхаду на пенсію. У большасці выпадкаў беларусы выбіраюць выплаты на працягу 5 гадоў. Мы бачым вялікую зацікаўленасць і працягваем гэтую работу».*

# Татаў прыклад



Малады тата Дзмітрый ГУЛЕВІЧ падчас прагулкі ў парку ўздоўж Свіслачы з дачкой Аляксандрай, пакуль малая спіць, любіць пазаймацца на турніках. Дзмітрый працуе ўрачом у сталічнай ветэрынарнай клініцы. Часу ў працоўны дзень у ветэрынара няшмат, таму кожную хвіліну на прагулцы з дачкой (Аляксандра — першае дзіця ў сям'і) ён выкарыстоўвае і для таго, каб падтрымліваць сябе ў форме. Пры сустрэчы малады бацька кажа: «Трэба паказваць дачцэ, хоць яна яшчэ і немаўля, прыклад добрага стаўлення да свайго здароўя, да фізічных практыкаваннняў, наогул выхоўваць культуру і павагу да жыцця».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Прэм'еру дакументальнага фільма «Ніколі больш» аб подзвігу камандзіра беларускага партызанскага атрада прадставяць у Маскве.**
- Прадпрыемствы Мінпрама ў 2023 годзе плануюць павялічыць аб'ём вытворчасці да Br27 млрд.
- **Мінпрацы прагназуе павелічэнне зарплат бюджэтнікаў на 16 працэнтаў у гэтым годзе.**



- Прадпрыемствы «Беллеспапераправа» ў 2022 годзе павялічылі экспарт у Расію ў 1,5 раза.
- **ДПК: больш за 23 тысячы іншаземцаў наведалі Беларусь па бязвізе з пачатку года.**

ISSN 1990 — 763X

23014

9 771990 763008

Ад усёй душы

## ВЫНІКІ І ПРАЦЯГ

**Мы вельмі патрэбныя адно аднаму. Розныя, але ў разуменні таго, наколькі кожны важны асабіста для мяне, — сакрэт гэтага жыцця. Няма выпадковых, няма чужых. Дзеці, моладзь, людзі іншых узростаў, рознага жыццёвага вопыту, з асаблівымі патрэбамі, розных характараў, поглядаў, але ўсе — неабходныя адно аднаму. Бо толькі праз людзей мы навучаемся жыць, любіць і паважаць іншых. А без гэтай навукі нам самім людзьмі не стаць.**

У канцы мінулага года падчас дабрачыннага свята ў рамках акцыі «Нашы дзеці» кіраўнік дзяржавы заклікаў удзяліць у навагоднія святы ўвагу не толькі дзецям, але і пажылым. У адказ міністэрства працы і сацабароны, адукацыі, грамадскія аб'яднанні «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя» зладзілі рэспубліканскую акцыю «Ад усёй душы». Яна доўжылася два першыя тыдні студзеня, але гэтымі днямі зусім не абмяжоўваецца ўвага і клопат аб старэйшым пакаленні, аб насельніках дамоў-інтэрнатаў, людзях з дадатковымі патрэбамі. Акцыя стала яшчэ адной нагодай гэтыя ўвагу і клопат падтрымаць, пашырыць, зрабіць больш значнымі.

Мерапрыемствамі былі ахоплены 150 тысяч пажылых людзей па ўсёй краіне, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Віншаванні дома атрымалі больш за 75 тысяч пажылых грамадзян. Больш за 50 тысяч маладых валанцёраў дапамагалі ім нарыхтоўваць дровы, набываць прадукты, чысціць снег. За ўвесь перыяд дабрачыннай акцыі амаль паўмільёна рублёў накіравана на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання, бальніц сястрынскага догляду і хоспісаў, а таксама на дапамогу і падарункі адзінокім пажылым грамадзянам.

«Гэтая акцыя атрымала «народны характар» і, без сумневаў, стане яшчэ адной добрай традыцыяй у перыяд навагодніх свят», — адзначае прэс-служба міністэрства.

СТАР. 5

Зімовая паводка

## СТУДЗЕНЬ, ШТО ЦЁПЛА СЦЕЛЕ, ДЫ МОКРА «СПАЦЬ»



Фота БелТА.

**Нетыповa высокія тэмпературы і моцныя дажджы сталі прычынай студзеньскай паводкі на Гомельшчыне. На тэрыторыі больш як паловы раёнаў вобласці ратавальнікі зарэгістравалі падтапленні талымі водамі прыватных падворкаў і участкаў дарог.**

СТАР. 3

# АБАРОНА НА ЗЯМЛІ І НА НЕБЕ

## Ахову дзяржаўнай граніцы абмеркавалі ў Прэзідэнта

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнні па ахове дзяржаўнай граніцы органамі пагранічнай службы ў 2023 годзе. Сёлета іх два — на абарону дзяржаўнай граніцы пагранічнікамі на зямлі, СПА — на небе. Бяспека на граніцы сёння — надзвычай важнае пытанне.**

Як паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, абстаноўка на дзяржаўнай граніцы застаецца прагназуемай і кантралюемай. Але захоўваюцца знешнія выклікі пагранічнай бяспецы, звязаныя з мілітарызацыяй прыгранічных рэгіёнаў Украіны і сумежных дзяржаў Еўрасаюза і актывізацыяй разведвальнай дзейнасці, а таксама спробамі пранікнення ў Беларусь радыкальна настроеных асоб. Таму размова ў Прэзідэнта мела шырокі і падрабязны характар. На мерапрыемства былі запрошаны дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч, міністр абароны Віктар Хрэнін, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль Лапо і начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл, першы намеснік міністра абароны Віктар Гулевіч.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта традыцыйнае мерапрыемства. Заўжды ў пачатку года прымаецца рашэнне аб ахове дзяржаўнай граніцы. «Асаблівасць гэтага года ў тым, што як ніколі раней абстаноўка вакол Беларусі, ваенна-палітычная абстаноўка, ды і эканамічная не такая простая. У гэтым ёсць адметнасць нашай сённяшняй сустрэчы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт пацікавіўся ў старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоля Лапо характарыстыкай сітуацыі на граніцы па раніцу панядзелка.

Другой тэмай, акрэсленай Аляксандрам Лукашэнкам, стала праблема з бежанцамі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што пра гэту тэму даўно не гаварылі і для грамадства яе не асвятлялі. «Мы цудоўна разумеем, што, хоць паток і зменшыўся, але ўсё роўна людзі ўцякаюць ад вайны. Добра, тут з Украіны, гэта людзі нашы, праблем тут асаблівых няма. Хто хоча прыязджае, застаецца ў нас на пастаяннае месца жыхарства, хтосьці просіць аказаць ім пэўныя паслугі: накарміць, напаіць, абагрэць, падлячыць. Гэта мы робім, тут праблем асаблівых няма», — сказаў ён. Але разам з тым, па словах Прэзідэнта, не спыняецца паток людзей з Азіі, з такіх краін, як Афганістан, Іран і іншых. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, людзі якой нацыянальнасці сюды ідуць, з якіх дзяржаў і як мяняецца паток бежанцаў.

Трэцяе вельмі важнае пытанне, якое датычыцца аховы дзяржаўнай граніцы, — армія. «Мы гэта не ўтойвалі, мы прыцягнулі немалыя сілы ў падтрымку пагранічным войскам з боку нашай арміі. Якая сітуацыя ў гэтым плане? Вы як камандуючы гэта павінны адчуваць, ці дастаткова сіл і сродкаў, якія мы накіроўваем для ўзмацнення дзяржаўнай граніцы, у тым ліку і на поўдні Беларусі, на граніцу з Украінай», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да Анатоля Лапо. «Там і міліцыя прыцягваецца, і мясцовыя органы ўлады, малайцы, падтрымліваюць, ні ў чым не адмаўляюць, ды і падраздзяленні Узброеных Сіл», — дадаў ён.

Гэты комплекс пытанняў быў разгледжаны, перш чым было зацверджана рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы.

Як далажыў старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, генерал-лейтэнант Анатоль Лапо, усе даручэнні кіраўніка дзяржавы органам пагранічнай службы ў 2022 годзе выкананы. Таксама Прэзідэнту далажылі аб выніках аховы граніцы ў 2022 годзе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### Задача на год — забяспечыць надзейнасць пагранічнай абароны

У размове з журналістамі **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, генерал-лейтэнант Анатоль ЛАПО** падкрэсліў, што ніколі ў гісторыі суверэннай Беларусі не прыходзілася ахоўваць граніцу з дзяржавай, дзе ідуць баявыя дзеянні. Гэта таксама накладвае свой адбітак. «Нам прыйшлося перабудаваць ахову граніцы на паўднёвых напрамках па ўсіх параметрах», — адзначыў ён.

Анатоль Лапо расказаў, што на 2023 год Прэзідэнтам пастаўлены задачы па ахове граніцы не менш важныя, чым былі летась. Па яго словах, тых сродкаў і сіл, якія маюць пагранічнікі, дастаткова, каб выканаць пастаўленыя задачы і забяспечыць надзейную ахову граніцы.

«Наша задача сёлета — забяспечыць надзейнасць пагранічнай абароны, пропуск у нашу краіну законапаслухмяных грамадзян і стаць надзейным шчытом ад тых, хто ідзе да нас з дрэннымі намерамі. І тэхнічных сродкаў, і персаналу дастаткова, каб гэта выканаць. Будуць новыя задачы — будзе новае абсталяванне», — падкрэсліў Анатоль Лапо.

**Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл, першы намеснік міністра абароны Віктар ГУЛЕВІЧ** расказаў, што напружанасць ваенна-палітычнай абстаноўкі прывяла да таго, што да рашэння аб ахове дзяржаўнай граніцы быў дададзены кампанент абароны ў паветранай прасторы. Адказнасць за гэтую задачу нясуць Узброеныя Сілы, з улікам развіцця ваенна-палітычнай абстаноўкі гэтая адказнасць толькі ўзрастае.

«Нашы сілы і сродкі гатовыя да прыкрыцця аператыўных кірункаў. Яны могуць зрэагаваць на рызыкі, праблемы і пагрозы. Менавіта развіццё абстаноўкі, яе напружанасць прымусіла нас летась павялічыць сілы і сродкі ў радыётэхнічных, ракетных і зенітных войсках. Прымяненне гэтых сродкаў дазваляе паніжаць і ў пэўнай ступені выключаць верагоднасць пралёту парушальнікаў граніцы на тэрыторыю нашай краіны», — сказаў Віктар Гулевіч.

# АБМЯНЯЛІСЯ ВІНШАВАННЯМІ, ПАГАВАРЫЛІ АБ ВАЖНЫМ

**Актуальны стан і перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з Кыргызстанам абмеркаваны ў час тэлефоннай размовы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Кыргызстана Садырам Жапаравым, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі.**

Лідары краін абмяняліся віншаваннямі з выпадку 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кыргызстанам.

Аляксандр Лукашэнка і Садыр Жапараў адзначылі істотны рост аб'ёмаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва па выніках 2022 года, важнасць прадаўжэння рэалізацыі і развіцця сумесных кааперацыйных праектаў. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі і інтэграцыйную тэматыку, таксама з улікам прыярытэтаў і задач беларускага старшынства ў АДКБ. У цэлым Беларусь і Кыргызстан эфектыўна супрацоўнічаюць на пляцоўках розных аб'яднанняў, уключаючы СНД, Еўразійскі эканамічны саюз, Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва.

# «Гістарычная памяць — гэта імунітэт супраць любой агрэсіі і варожасці»

**Мінулы год праходзіў пад знакам захавання гераічнай спадчыны і праўды аб усіх перыядах жыцця беларускага народа. Што зроблена ў рамках яго на Магілёўшчыне — у нашай размове з намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерыем МАЛАШКАМ.**



***— Мінулы год быў багаты на розныя патрыятычныя мерапрыемствы, падчас іх ішла размова пра герояў, рухавікоў прагрэсу, дзякуючы якім квітнее і жыве наша краіна. Наколькі гэта важна і патрэбна?***

— Гістарычная памяць і патрыятызм — найважнейшыя фундаментальныя каштоўнасці беларускага народа. Усведамляючы сябе спадчыннікамі народа-пераможцы, мы, як сапраўдныя патрыёты сваёй краіны, у гэты няпросты перыяд нясём адказнасць за лёс сваёй Радзімы. Мы адзіныя ў сваёй сіле духу, у сваёй праўдзе, у любові да роднай гісторыі, родных мясцін, роднай краіны. У патрыятызме моладзі — будучыня Беларусі. Гэта магутная сіла, якая спрыяе развіццю нашай дзяржавы.

У нас ёсць вядомыя гістарычныя асобы, якія аказалі ўплыў на фарміраванне беларускай дзяржаўнасці і развіццё беларускай культуры. Мы ганарымся імі і распаўсюджваем інфармацыю пра іх. У іх ёсць паслядоўнікі, якія на сённяшнім этапе дабіліся высокіх вынікаў у грамадскай і палітычнай дзейнасці, культурным і спартыўным жыцці, якія карыстаюцца аўтарытэтам і робяць унёсак у развіццё розных галін народнай гаспадаркі. Мы ўвекавечваем памяць нашых славутых людзей у назвах вуліц, плошчаў і праспектаў, адкрываем памятныя дошкі, называем у гонар герояў школы і іншыя ўстановы.

Шмат увагі — духоўна-маральнаму выхаванню. Гэта і дабрачынныя акцыі, і стварэнне летапісаў працоўнай славы, клопат пра ветэранаў, рэалізацыя праектаў па папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў, сацыялізацыя людзей з абмежаванымі магчымасцямі, мерапрыемствы, прысвечаныя юбілейным датам, вахты памяці, аўтапрабегі, дыялогавыя пляцоўкі і шмат іншых, накіраваных на выхаванне людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Патрыятычная акцыя «Звон смутку» па ахвярах Вялікай Айчыннай вайны, абласны праект «#Мая_Зямля_Прыдняпроўе», маладзёжная ініцыятыва «Беларусь — крыніца натхнення» дапамагаюць адчуць важнасць той работы, якая сёння праводзіцца ў вобласці. У ёй задзейнічаны і школьнікі, і ветэраны, і моладзь, і працоўныя калектывы, і грамадскія арганізацыі.

Знакавым мерапрыемствам, якое сімвалізуе захаванне нашай культурнай і духоўнай спадчыны, стала ўрачыстая цырымонія адкрыцця і асвячэння помніка свяціцелю Георгію Каніскаму. Велічная бронзавая скульптура, створаная па ініцыятыве мясцовага дабрачыннага фонду памяці Георгія Каніскага пры падтрымцы аблвыканкама, Магілёўскага гарвыканкама і Магілёўскай епархіі, размясцілася на назіральнай пляцоўцы перад паркам у Падміколлі. Гэты славуты асветнік на працягу 40 гадоў быў архіепіскапам Магілёўскім, Мсціслаўскім і Аршанскім, шмат чаго стварыў карыснага для адукацыі нашых грамадзян.

У Год гістарычнай памяці мы рабілі ўсё, каб надаць імпульс увекавечанню памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны. У вёсцы Верамееўка Клічаўскага раёна абноўлены мемарыял у гонар байцоў спецатрада «Слаўны». Тутэйшыя лясы і балоты сталі цэнтрам партызанскага руху літаральна з першых дзён Вялікай Айчыннай, тут базіраваліся кіраўніцтва падполля і 18 тысяч байцоў. Указам Прэзідэнта Клічаў узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Калі бываеш у такіх месцах, пачынаеш душой адчуваць, наколькі наш свет крохкі і як важна яго шанаваць.

***— Адным з адметных мерапрыемстваў, прысвечаных Вялікай Перамозе і Году гістарычнай памяці, стаў праект ад моладзі «Дарогамі памяці і славы». Жыхары вобласці атрымалі шмат уражанняў і інфармацыі пра мінулае сваёй радзімы. Гучалі пажаданні, каб праект працягваўся.***

— Гэта адна са значных маладзёжных ініцыятыў. Яе мэта — згуртаванне жыхароў Магілёўшчыны на аснове гістарычных і гераічных традыцый Радзімы, супрацьстаянне спробам скажэння праўды аб ролі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, папулярызацыя дасягненняў сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Удзельнікі праекта паўтарылі слаўны шлях вызваленцаў, праехалі аўтакалонай па месцах баявой славы на стылізаваных аўтамабілях, з перасовачнай выставай, палявой кухняй і іншай атрыбутыкай таго часу. У месцах прыпынкаў яны сустракаліся з жыхарамі, паказвалі канцэрты, праводзілі дыялогавыя пляцоўкі, ускладалі кветкі да помнікаў і мемарыялаў, знаёміліся з гісторыяй канкрэтнай мясцовасці. З сабой яны бралі зямлю з месцаў воінскіх пахаванняў для будучага музея воінскай славы Магілёўскай вобласці на Буйніцкім полі. Зямля, палітая крывёю нашых абаронцаў і вызваленцаў, стане адной з найкаштоўнейшых святынь гэтага музея. У нашай краіне няма сям'і, якую не закранула б Вялікая Айчынная вайна. Немагчыма забыць тысячы спаленых разам з жыхарамі вёсак, разбураныя гарады, закатаваных старых і дзяцей, гора і слёзы нашых землякоў, якія не дачакаліся сваіх родных і блізкіх з вайны.

***— Як супрацьстаяць працэсам скажэння гісторыі, узвядзення ў абсалют сумнеўных каштоўнасцяў, знявагі здабыткаў і подзвігаў народаў Беларусі і Расіі?***

— Сапраўды, у сённяшнім свеце асобныя сілы спрабуюць перапісаць гісторыю на карысць зменлівым палітычным інтарэсам, рэабілітаваць нацызм, пасеяць варожасць паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў, братамі-славянамі — падштурхоўваюць свет да новых канфліктаў, гвалту і жорсткасці. Таму сёння асабліва важна зберагчы і захаваць гістарычную праўду, якая служыць збліжэнню людзей у імя ідэалаў дабра і міласэрнасці і нагадвае нам, нашым дзецям, унукам, як важна шанаваць і засцерагаць мір і грамадскую згоду.

Гістарычная памяць аб тых страшных гадах — гэта імунітэт супраць любой ваеннай агрэсіі і варожасці. Як сказаў Прэзідэнт: «Фашызм і нянавісць пад сцягамі дэмакратыі беларусы на сваёй зямлі не прапусцяць. Мы працягваем выхоўваць сваіх дзяцей на каштоўнасцях міру і чалавечага жыцця!» Дзесяцігоддзі міру дазволілі нам пераўтварыць папараненую беларускую зямлю ў квітнеючы сад, пабудаваць незалежную дзяржаву, у якой можна спакойна жыць, вучыцца, працаваць, разам будаваць годную будучыню.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Дзмітрыю Фёдаравічу Мезенцаву, дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія і шчырыя спачуванні дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы Мезенцаву Дзмітрыю Фёдаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"» выказвае шчырыя спачуванні Дзмітрыю Фёдаравічу Мезенцаву, дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# СТУДЗЕНЬ, ШТО ЦЁПЛА СЦЕЛЕ, ДЫ МОКРА «СПАЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Веткаўскім раёне, на тэрыторыі Хальчанскага сельскага Савета, падтопленая месцамі больш чым на метр дарога адрэзала ад «вялікай зямлі» жыхароў пасёлка Палянаўка і найбліжэйшага садовага таварыства. З-за разліву Сожа і возера Чэчаль, што якраз на пойме ракі, мясцовыя жыхары ў падобнай сітуацыі аказваліся ўжо не раз. Але толькі ў вясновую паводку, зімой — ніколі.

— Яшчэ ў пачатку мінулага тыдня ў пасёлак можна было дабрацца на легкавым аўтамабілі, але літаральна за дзень дарогу ўжо перакрыла вада, — уводзіць у курс жыцця ў сельскай «венецыі» **старшыня Хальчанскага сельвыканкама Валерый ЖОЛУДЗЕЎ.** — На перыяд паводкі жыхары перасяляцца адмовіліся. Мы правялі сустрэчу з насельніцтвам, абмеркавалі ўсе хвалюючыя пытанні, а гэта дастаўка людзей з пасёлка і назад, забеспячэнне прадуктамі харчавання, медыцынскае абслугоўванне. Вырашылі наладзіць лодачную пераправу па падтопленай дарозе.

Як адзначае Валерый Жолудзеў, у Палянаўцы пастаянна пражывае 21 чалавек, яшчэ чатыры сям'і засталіся на зіму ў садовым таварыстве. Частка мясцовых мусіць выязджаць з Палянаўкі на працу. Таксама ў пасёлку пражывае школьнік, які вучыцца ў аграгарадку Старое Сяло гэтага ж сельсавета. У аграгарадок паляноўскім неабходна дабірацца таксама і ў амбулаторыю, туды ж па лекі ў аптэку.

Пераправа арганізавана, а таму людзі не хвалююцца аб тым, як дабрацца на «вялікую зямлю».

— Настроены нашы жыхары пазітыўна, — запэўнівае старшыня сельскага Савета, з якім палянаўцы могуць звязацца кругласутачна.

Аператыўна аб любой сітуацыі, якая хвалюе мясцовых, улады і адказныя службы інфармуе і памочнік старшыні Хальчанскага сельвыканкама па пасёлку Палянаўка Аляксандр Францішоў.



Фота БелТА.

У час аказання дапамогі жыхарам в. Палянаўка.

— Больш за ўсё вады прыбыло за ноч з чацвярга на пятніцу, — падзяліўся назіраннямі Аляксандр Аляксандравіч.

Кажа, што іх Палянаўка з-за вялікай вады была востравам у 2013 годзе.

— Самыя вялікія паводкі тут былі, як расказвала маці, у 1932 годзе, вада стаяла па вокны, потым — у 1970 годзе. Летась рака таксама падымалася, але гэта было ўвесну, узімку не залівала дарогу да нас ніколі, — расказаў Аляксандр Францішоў.

Начныя маразы, якія вярнуліся на Гомельшчыну на выхадных, месцамі заўважна «падсушылі» рызыкоўныя ўчасткі. На сярэдзіну дня панядзелка ўзровень вады на тэрыторыі падтопленай дарогі ў Веткаўскім раёне стабілізаваўся.

— Апошнія тры дні ўвесь час маніторылі сітуацыю. На дамбе, на пад'ездзе да Палянаўкі, вада больш не падымаецца. Мясцовыя жыхары спадзяюцца, што ўжо за гэты тыдзень вада пачне спадаць. Цяпер жыхары звязваюцца толькі для таго, каб перадаць падзяку за дапамогу, якую атрымалі ад Чырвонага Крыжа, — распавядае пра настрой жыхароў Валерый Жолудзеў.

Валерый Мікалаевіч тлумачыць, што да падтаплення дарогі ў пасёлак два разы на тыдзень прыязджала аўтакрама. Пакуль па прадукты мясцовыя жыхары дабіраюцца на лодцы. Між тым прадукты першай неабходнасці, пітную ваду, гігіенічныя сродкі прывезлі спецыялісты Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа. Валанцёры каманды рэагавання Гомельскай абласной арганізацыі БЧК прывезлі дапамогу нават па індывідуальных просьбах людзей.

— Гомельская абласная арганізацыя ў цесным супрацоўніцтве з абласным упраўленнем МНС сочыць за развіццём паводкавай сітуацыі ў цэлым у рэгіёне, — падкрэсліў начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Арцём Карпенка. — Мы гатовы аператыўна рэагаваць і аказаць дапамогу жыхарам у любым пункце вобласці.

Што да лодачнай пераправы для жыхароў пасёлка Палянаўка і найбліжэйшага садовага таварыства — па вадзе неабходна пераадолець больш за кіламетр, — то дзяжурства нясуць супрацоўнікі Веткаўскай ратавальнай станцыі Таварыства ратавання на водах.

— Першыя заяўкі аб пераправе да аграгарадка Старое Сяло пачалі паступаць ад людзей у першы ж дзень арганізацыі лодачнай пераправы. Працуем з шасці раніцы да дзесяці вечара. Па меры неабходнасці людзей, якія ў тым ліку дабіраюцца на працу, перапраўляюць на плаўсродку. Калі спатрэбіцца экстранна кагосьці пераправіць ноччу, то на дапамогу прыйдуць найбліжэйшыя падраздзяленні МНС, — растлумачыў, як наладжана работа на гэтым участку падтаплення дарогі, выконваючы абавязкі начальніка Веткаўскай ратавальнай станцыі АСВОД Сяргей Сілкін.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## У тэму

У рэгіёне органы мясцовага кіравання і ўсе адказныя службы рыхтуюцца да любога варыянта развіцця паводкавай сітуацыі і гатовы ажыццяўляць комплекс мер па мінімізацыі магчымых наступстваў паводкі. Для кожнага суб'екта гаспадарання вобласці распісаны першачарговыя мерапрыемствы, праведзена праверка наяўнасці і стану неабходнай тэхнікі, а таксама рэзерв матэрыяльных рэсурсаў для ліквідацыі наступстваў магчымай паводкі.

У сваю чаргу ратавальнікі ў рэгіёне штодзень маніторацць сітуацыю на тэрыторыях, дзе зафіксаваны падтапленні талымі водамі, і прапануюць гаспадарам падворкаў сваю дапамогу. Па інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, жыццезабеспячэнне насельніцтва ні на адным з участкаў не парушана, пацярпелых няма, вядзецца маніторынг гідралагічнага становішча.

Супрацоўнікі МНС рэкамендуюць адказна кантраляваць сітуацыю і самім гаспадарам падворкаў, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі падтаплення. Сярод асноўных рэкамендацый ад ратавальнікаў — ачысціць дрэнажныя, сцёкавыя канаўкі, тэрыторыю каля дома ад снегу і лёду, які перашкаджае сходу вады; ні ў якім разе не карыстацца электрапрыборамі, не ўключаць асвятленне ў падтопленых памяшканнях; падрыхтавацца да магчымай эвакуацыі і сабраць «трывожны» чамаданчык (грошы, дакументы, адзенне, прадукты харчавання, лекі); пры неабходнасці прадугледзець вываз хатніх жывёл. Калі ўзнікне неабходнасць у эвакуацыі, тэрмінова звязацца з ратавальнікамі і паведаміць аб сваім месцазнаходжанні.

На слыху

# РЭПЕТЫЦЫЯ ВЫПУСКНОГА ЭКЗАМЕНУ

**28 студзеня ў краіне пройдзе рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен (ЦЭ). Удзел у ім возьмуць каля 53 тысяч адзінаццацікласнікаў. «Рэпетыцыя» пройдзе ва ўсіх рэгіёнах Беларусі — у 144 пунктах. У Мінску іх дванаццаць.**

Як тлумачаць у Міністэрстве адукацыі, гэта неабходна для таго, каб адпрацаваць працэдуру правядзення новай формы атэстацыі выпускнікоў школ. А пры выяўленні любых нечаканых нюансаў яшчэ будзе час, каб іх аператыўна ўстараніць.

Нагадаем, што цэнтралізаваны экзамен для выпускнікоў школ упершыню пройдзе 14 і 21 мая бягучага года. Прадугледжаны таксама рэзервовыя дні ў маі, ліпені і жніўні.

Рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен будзе праходзіць па адпрацаванай за многія гады тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання ў тэставай форме. Навучэнцы ўжо выбралі прадмет, па якім яны будуць рэпеціраваць правядзенне будучага выпускнога экзамену. Далей арганізуецца дастаўка хлопчыкаў і дзяўчынак у пункты тэсціравання. Калі гэта сельская школа, то арганізуюць падвоз, гэта значыць, органы ўпраўлення адукацыі змогуць змадэляваць арганізацыю падвозу навучэнцаў. На саміх пунктах — прапускны рэжым, размеркаванне школьнікаў па аўдыторыях.

З боку педагагічнай грамадскасці 28 студзеня будзе задзейнічана каля васьмі тысяч чалавек. У асноўным гэта тыя педагогі, якія будуць працаваць і на самім ЦЭ. Для гэтага рэпетыцыя і задумана, каб людзі атрымалі вопыт і былі ліквідаваны «вузкія месцы».

Вынікі «рэпетыцыі» будуць даступныя на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў па звестках пашпарта праз 2-3 тыдні пасля здачы.

Як запэўніваюць у Міністэрстве адукацыі, адзнака за рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен ні на што не паўплывае. Настаўнікі не будуць яе выстаўляць у журнал. «Гэта ацэнка патрэбна толькі самому навучэнцу для вызначэння свайго ўзроўню падрыхтоўкі па прадмеце», — канстатуюць у адукацыйным ведамстве. Паглядзеўшы вынікі рэпетыцыі, у кожнага будзе магчымасць і пэўны час, каб устараніць недахопы ў ведах».

У Міністэрстве адукацыі лічаць, што аб'яднанне выпускных і ўступных іспытаў у ВНУ істотна зменшае нагрузку на выпускнікоў, якім яшчэ год таму даводзілася здаваць чатыры іспыты на выхадзе са школы плюс тры ці чатыры ЦТ. Прычым, калі ў школе яны пісалі пераказ ці кантрольную работу, цяпер адбылася ўніфікацыя формаў экзаменацыйных выпрабаванняў. І ЦЭ, і ЦТ здаюцца ў тэставай форме, што істотна спрашчае падрыхтоўку.

Да таго ж новая мадэль дазваляе забяспечыць больш матываваны выбар будучай прафесіі, бо яшчэ на этапе, які прадмет выбраць на ЦЭ, адзінаццацікласнікі вызначаюцца з далейшай траекторыяй навучання пасля атрымання школьнага атэстата.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіраўнік Еўрасавета Мішэль: бліжэйшыя два-тры тыдні вызначаць развіццё канфлікту ва Украіне

**Прэзідэнт Еўрапейскага савета Шарль Мішэль заявіў, што бліжэйшыя два-тры тыдні стануць вырашальнымі для канфлікту ва Украіне. Аб гэтым палітык паведаміў у інтэрв'ю іспанскай газеце El Mundo.**

Па словах Мішэля, у гэты перыяд вызначыцца далейшае развіццё падзей ва Украіне. «Наступныя тыдні, 2 ці 3, з'яўляюцца вырашальнымі. Для канфлікту і для міру. Ад бліжэйшых тыдняў залежыць тое, што адбудзецца ў 2023 годзе, і шмат чаго, што вызначыць нашу будучыню», — падзяліўся Мішэль.

Таму кіраўнік Еўрапейскага савета заклікаў працягваць падтрымліваць Украіну і пастаўляць усю неабходную дапамогу.

Раней Мішэль казаў, што ўводзіць новыя санкцыі супраць РФ усё цяжэй. Ён заначыў, што ў Еўрасаюза ёсць інструменты, але далейшыя крокі будуць цяжкія.

17 студзеня кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен гаварыла аб планах ЕС увесці дзясяты пакет санкцый у дачыненні да Расіі.

## За пяць гадоў ФРГ апярэдзіць Японію і стане трэцяй эканомікай свету па памеры ВУП

**На працягу найбліжэйшых пяці гадоў Германія абгоніць Японію па памеры валавога ўнутранага прадукту (ВУП) і стане трэцяй эканомікай свету. Гэтаму будзе садзейнічаць невысокі тэмп эканамічнага росту ў Японіі і нізкі курс ены ў адносінах да долара, паведамляе ТАСС са спасылкай на разлікі эксперттаў даследчага інстытута пры страхавой кампаніі Dai-ichi Life.**

«Па стане на 2022 год, паводле ацэнкі Міжнароднага валютнага фонду, ВУП Японіі перавышаў $4,3 трлн. У Германіі ён быў на 6,7 % меншы. У 2023 годзе пры захаванні цяперашніх тэндэнцый розніца скароціцца да 6 % і, цалкам верагодна, сыдзе на нішто на працягу бліжэйшых пяці гадоў», — гаворыцца ў матэрыяле.

Да 2010 года Японія саступала толькі ЗША па памеры намінальнага ВУП. Але дзякуючы высокім тэмпам эканамічнага росту Кітай здолеў пацясніць з гэтай пазіцыі Токіа. Да 2028 года Японія можа выпасці з тройкі лідараў і перамясціцца на чацвёртую пазіцыю.

## На футбольным матчы ўпершыню ў гісторыі паказалі белую картку



**У матчы паміж жаночымі партугальскімі камандамі «Бенфіка» і «Спортынг» упершыню ў гісторыі суддзя паказаў белую картку. Пра гэта паведамляе Sport Bible.**

Матч адбыўся 21 студзеня і завяршыўся разгромнай перамогай «Бенфікі» з лікам 5:0. У сустрэчы адной з футбалістак стала дрэнна, на полі з'явіліся медыцынскія брыгады абедзвюх каманд. Пасля таго як урачы нармалізавалі стан спартсменкі, суддзя паказаў ім белую картку ў якасці падзякі за аказаную дапамогу.

Міжнародная федэрацыя футбола (ФІФА) увяла выкарыстанне белых картак у Партугаліі ў якасці эксперыменту. Такім чынам планецца дзякаваць удзельнікам матчаў за сумленную гульню і павышаць этычную каштоўнасць у спорце.

Экабяспека

# КАБ ПАМЕНШАЛА ПЛАСТЫКУ

## Магчыма, малако хутка будзем купляць у шкляных бутэльках




**На Зямлі ўжо ўтварылася 8,3 млрд тон, 79 % з якіх — на звалках і ў навакольным асяроддзі, сцвярджаюць спецыялісты. І станоўчая дынаміка росту адходаў працягвае назірацца ва ўсім свеце. Такім чынам на 3-5 % за год павялічваецца ўтварэнне цвёрдых камунальных адходаў і на 5-6 % — пластыкавых. Каб спыніць гэтую тэндэнцыю, неабходна ўкараняць сучасныя тэхналогіі збору смецця і вымаць з яго другасныя матэрыяльныя рэсурсы. Максімальна перапрацоўваць іх, вырабляючы тавары і атрымліваючы энергію. А таксама замяняць пластыкавую прадукцыю экалагічна бяспечнай, заключаюць эксперты.**

### Стымуляцыя рублём



Удзельнічаць у працэсе перабудоўвання свядомасці са спажывецкай на рацыянальную жыхароў і арганізацыі краіны заахвочваюць рублём: адны — плацяць грошы, другія — іх атрымліваюць.

— Працэс паэтапнага змяншэння выкарыстання пластыкавай упакоўкі ў краіне і яе замены экалагічна бяспечнай прадугледжвае эканамічнае стымуляванне. Сёлета пастановай урада № 60 зацверджаны эканамічна абгрунтаваныя памеры кампенсацый за арганізацыю збору адходаў, тавараў і ўпакоўкі. Пашыраны віды адходаў, за якія выплачваецца кампенсацыя (150 рублёў за тону), за кошт уключэння адходаў паперы і кардону з прапіткай і пакрыццём, — расказаў **Аляксей ФІЛАНОВІЧ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** — Пашыраны пералік прадукцыі, для вырабу якой прымяняецца шкляная бутэлька. У прыватнасці, павялічаны памер выплаты кампенсацыі расходаў (з 15 да 17 капеек за штуку) за прымяненне шкляной бутэлькі пры вырабе, разліве ўсіх відаў пітной вады.

Сарціроўкай шклабою ў краіне займаецца кіруючая кампанія холдынгу «Белрэсурсы», вытворчая магутнасць якога — 120 тысяч тон на год пры трохзменным рэжыме работы. На справе ж загружана прадпрыемства на 70 %, перапрацоўваючы каля 90 тысяч тон. Пры гэтым кожны пяты кілаграм у краіне, які паступае на прадпрыемствы па сарціроўцы змешанага шклабою, нарыхтаваны прадпрыемствамі холдынгу, падзяліўся **Гадад ГАЛІМАЎ, намеснік генеральнага дырэктара таварыства «Белрэсурсы»:**

— На ўнутраны рынак Беларусі пастаўляецца сартаваны запатрабаваны шклабой. Незапатрабаваны зялёны шклабой і адсеў змешанага шклабою пакуль рэалізуецца на знешнія рынкі. Пры гэтым «Белрэсурсы» падтрымліваюць айчынныя шклатарныя прадпрыемствы, пастаўляючы ім шклабой па кошце да 40 % ніжэйшым, чым цана на знешнім рынку. А на экспарт ідзе толькі незапатрабаваны ўнутры Беларусі аб'ём шклабою.

Са шклатарным заводам у Гродне, дзе ўводзяцца новыя магутнасці, ужо прапрацавана пытанне аб пастаўках з вясны зялёнага шклабою ў штомесячным памеры каля дзвюх тысяч тон. Гэта якраз тыя памеры, якія ўтвараюцца ў выніку сарціроўкі шклабою. Адпаведна з планам мерапрыемстваў па паэтапным замяшчэнні палімернай упакоўкі экалагічнай і бяспечнай, «Белрэсурсамі» вызначаны мерапрыемствы па стварэнні і ўводзе дадатковых магутнасцяў па сарціроўцы змешанага шклабою па меры загрузкі існуючых магутнасцяў, дадаў спецыяліст прадпрыемства.

Нарыхтоўшчыкі арганізацыі спажывецкай кааперацыі, як і раней, напоўніцу набліжаны да сельскіх жыхароў і накіраваны на максімальны прыём другаснай сыравіны ад людзей. За бутэльку насельніцтва атрымлівае ад 5 да 20 капеек, што нашмат выгадней, чым збіраць шклабой, заўважыла **Аксана СКІНДЭР, начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза:**

— Забыты стары кірунак, якому цяпер удзяляецца ўвага, — вытворчасць харчовых прадуктаў у шматабаротнай шкляной тары. Нашы спецыялісты летась прынялі больш за 7 млн адзінак шматабаротнай шкляной тары, а сёлета — звыш 3 млн. Такую тару прапаноўваюць і прадаюць вытворцам соку, піва, газіраваных напояў. На шкляную бутэльку для малака і вяршкоў плануюць пераходзіць і многія малочныя заводы.

### Бяспечная ўпакоўка: тканінная, папяровая, кардонная

У Беларусі пастаянна ствараюцца новыя і мадэрнізуюцца старыя вытворчасці па вырабе экалагічна бяспечнай упакоўкі з паперы, кардону, шкла, дадаў **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

— У 2019 годзе былі запушчаны лініі па вырабе папяровых пакетаў з вырубнымі ручкамі (альтэрнатыва пакету-майцы) і пакетаў з плоскімі ручкамі. Пашыраецца таксама асартымент прадукцыі. Напрыклад, выраблецца крафт-мяшэчная папера з беленай цэлюлозы — яе можна выкарыстоўваць для вырабу разнастайных пакетаў, а таксама для ўпакоўкі харчовых прадуктаў: мукі, цукру і іншых.

Сярод мер, што прымаюцца для змяншэння колькасці ўпакоўкі, абмежаванне аб'ёму пластыкавай тары для безалкагольных і слабаалкагольных напіткаў максімальнай умяшчальнасцю да аднаго літра. Зацверджаны пералік прадметаў аднаразовага пластыкавага посуду, забароненых для выкарыстання ў аб'ектах грамадскага харчавання. Замест іх у такіх аб'ектах рэалізуецца посуд з матэрыялаў раслліннага паходжання і прыдатных да біяраскладання.

— Мяркуецца, што да канца гэтага года аб'ём рэалізацыі экалагічна бяспечнага посуду павінен дасягнуць 40 %, а да канца 2025-га — 70 %. У рознічным гандлі сеткі спажывецкай кааперацыі рэалізуецца таксама мінеральная і пітная вада ў шкле. Прысутнічаюць папяровыя пакеты і тэкстыльныя сумкі — шоперы, — агучыла **Таццяна КАСЯКОВА, намеснік начальніка ўпраўлення прамысловасці, якасці і стандартызацыі Белкаапсаюза.**

Работай па скарачэнні выкарыстання палімерных матэрыялаў займаюцца ў розных сферах айчыннай эканомікі. У прамысловай галіне хлебабулачныя вырабы пакуюцца ў папяровыя пакеты, кандытарскія — у кардонныя карабы. У мясаперапрацоўчых цэхах увага ўдзяляецца выпуску прадукцыі хатняга асартыменту (звыш за 60 % ад агульнага аб'ёму выпуску мясных прадуктаў). Каўбасы пераважна выпускаюць у натуральнай абалонцы і ва ўпакоўцы з выкарыстаннем тэкстылю: сетак і тэкстыльных абалонак. У вінаробнай галіне — толькі шкляная ўпакоўка: зваротная і новая.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Надвор'е

# ДА ВЫХАДНЫХ НАЧНЫЯ МАРАЗЫ БУДУЦЬ ДАСЯГАЦЬ 10—13 ГРАДУСАЎ

## А разам з мокрым снегам на дарогах будзе суцэльная галалёдзіца

**У першыя дні тыдня ў нашай краіне працягвае ўтрымлівацца павышаны тэмпературны фон у асноўным на 4—7 градусаў вышэй за кліматычную норму з адпакамі ў выглядзе мокрага снегу, дажджу і туманамі, што больш нагадвае надвор'е канца лістапада. У бліжэйшыя дні кіраванне надвор'ем пяройдзе да вобласці павышанага атмасфернага ціску і вільготнай паветранай масы. У аблоках з'явяцца праясненні, ападкаў стане менш, а тэмпературная анамалія паменшыцца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах па крайняй поўначы краіны прагназуецца невялікі кароткачасовы снег і мокры снег. Месцамі магчымы слабы туман і шэрань, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 0 да мінус 7 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 10. Днём слупок тэрмометра пакажа мінус 3 — плюс 2 градусы.

У чацвер чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы краіны пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. Месцамі слабыя туман і шэрань, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 1 да 7 градусаў ніжэй за нуль, а пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Максімальная тэмпература днём складзе мінус 3 — плюс 2 градусы.

У пятніцу месцамі па Беларусі пройдзе невялікі снег і мокры снег. У асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе да 1—7 марозу, а пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Днём — мінус 4 — плюс 2 градусы.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у суботу прагназуецца пераважна без ападкаў. У асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 9—12 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла.

А вось у канцы тыдня тэрыторыя нашай краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, ападкі стануць больш інтэнсіўнымі і распаўсюдзяцца яны на большую частку тэрыторыі.



У нядзелю ноччу па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдзе снег, мокры снег. У асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да мінус 2—8 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 9—13. Днём слупок тэрмометра будзе ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла.

Увага! На Бярэзіне каля Бабруйска (Магілёўская вобласць) узровень вады перавысіў небяспечна высокую адзнаку, пры якой раней назіраліся затапленні прыбярэжных тэрыторый. Белгідрамет абвясціў штармавое гідралагічнае папярэджанне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Лясныя артэрыі

# ДАРОГА — НЕ ПРОСТА ЛІНІЯ НА КАРЦЕ

**Будаўніцтва лесагаспадарчых дарог застаецца адной з найважнейшых задач у Мінлясгасе. Толькі летась у лясным фондзе ведамства пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю 19 новых аб'ектаў працягласцю больш за 114 кіламетраў, паведамляе прэс-служба міністэрства.**

Найбольшая колькасць лясных артэрый традыцыйна будуецца ў Віцебскай вобласці. У 2022 годзе тут уведзена сем аб'ектаў агульнай працягласцю 44 кіламетры. У Багушэўскім лясгасе пабудавана і ўведзена ў строй адна лесагаспадарчая дарога, у Лепельскім — тры (дзве ў Стайскім лясніцтве, адна ў Красналуцкім лясніцтве), ва Ушацкім лясгасе — дзве (у Кубліцкім і Плінскім лясніцтве) і ў Шумілінскім — адна лесагаспадарчая дарога ў Другім Дрэтунскім лясніцтве.

У Гомельскім дзяржаўным вытворчым лесагаспадарчым аб'яднанні (ДВЛГА) за мінулы год уведзена ў эксплуатацыю пяць лесагаспадарчых дарог агульнай працягласцю 35 кіламетраў па адной на кожны лясгас: у Навінкаўскім лясніцтве Васілевіцкага лясгаса, у Добрушскім лясніцтве Гомельскага лясгаса, у Засінцаўскім лясніцтве Ельскага лясгаса, у Беразнянскім лясніцтве Жыткавіцкага лясгаса, у Бароўскім і Прыбалавіцкім лясніцтвах Мілашавіцкага лясгаса.

У Магілёўскім ДВЛГА пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю чатыры дарогі, з іх па адной у Горацкім і Клічаўскім лясгасах і дзве ў Краснапольскім лясгасе; у Брэсцкім ДВЛГА — дзве лесагаспадарчыя дарогі ў Кобрынскім лясгасе; у Мінскім ДВЛГА — адна ў Барысаўскім лясгасе.

Самая працяглая новая лесагаспадарчая дарога з'явілася ў 2022 годзе ў Бароўскім і Прыбалавіцкім лясніцтвах Мілашавіцкага лясгаса працягласцю крыху больш за 12 кіламетраў, а самая кароткая — у Наваельнянскім лясніцтве Краснапольскага лясгаса даўжынёй крыху больш за 700 метраў.

Будаўніцтва лесагаспадарчых дарог у краіне рэалізуецца ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Беларускі лес». Наяўнасць такіх аб'ектаў дае магчымасць не толькі асвойваць новыя рэсурсы, але і своечасова праводзіць лесааднаўленчыя работы і мерапрыемствы па барацьбе з хваробамі і шкоднікамі лесу, у больш сціслыя тэрміны ліквідаваць лясныя пажары. Лесагаспадарчыя дарогі выконваюць таксама важную сацыяльную нагрузку, звязваючы ў асобных выпадках населеныя пункты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦЁПЛЫЯ ВІЗІТЫ

**У кожным раёне Гродзенскай вобласці прайшлі дзясяткі дабрачынных мерапрыемстваў**

**Цяпер у рэгіёне пражывае звыш 240 тысяч чалавек ва ўзросце 60 гадоў і больш. З іх 18 тысяч — адзінокія і інваліды.**

Як расказала **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Вольга СЯДЗЕЛЬНІК,** акцыяй «Ад усёй душы» ахоплена 16 тысяч грамадзян, валанцёрскай дапамогай — 8 тысяч адзінокіх і інвалідаў. Значная ўвага — раённым тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання. Напрыклад, у Навагрудку гэтай структуры ўручаны сертыфікат на 13 тысяч рублёў, там быў арганізаваны калядны канцэрт. У аддзяленні дзённага знаходжання для пажылых грамадзян Ленінскага раёна Гродна, якое наведвае на пастаяннай аснове 70 чалавек, адбылася дыялогавая пляцоўка ў фармацэ салодкага стала. У выніку акцыі ў аддзяленні з'явіліся два тэлевізары ад дабрачынцаў.



Фота з адкрытых крыніц.

Цёпла сустрэлі высокіх гасцей у Жухавіцкім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў. Разам з салодкімі пачастункамі ўстанове быў падораны халадзільнік, мікрахвалевая печ, два сертыфікаты на суму звыш пяці тысяч рублёў.

У рамках акцыі прайшлі ўшанаванні юбіляраў. Са 100-гадовым юбілеем прадстаўнікі ўлады, супрацоўнікі мясцовай сельскай гаспадаркі павіншавалі падапечную Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Ваўкавыскага раёна Веру Манцкевіч. У рамках акцыі ўладамі і ўстановамі Воранаўскага раёна набыты тэлевізар для аддзялення сястрынскага догляду Радунскай участковай бальніцы. У такіх жа аддзяленнях бальніц Смаргонскага раёна пацыентам уручаны навагоднія падарункі, сродкі гігіены, бялізна. Арганізавана канцэртная праграма.

Акцыя «Ад усёй душы» шырока прайшла ў дамах-інтэрнатах, аддзяленнях кругласутачнага пражывання, дамах сумеснага самастойнага пражывання. Віншаванні ў сябе дома атрымалі амаль 14 тысяч чалавек.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# УВАГА — САМЫ КАШТОЎНЫ ПАДАРУНАК

**У Гомельскай вобласці дабрачынная акцыя для пажылых людзей «Ад усёй душы» аб'яднала актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Юнакі і дзяўчаты з усіх раёнаў завіталі ў госці да адзінокіх пажылых людзей, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў працы і перадалі віншаванні ды падарункі.**

Аднымі з першых да рэспубліканскай акцыі далучыліся актывісты БРСМ у Гомелі. Моладзь наведала дома гараджан шаноўнага ўзросту. Павіншавалі з векавым юбілеем Ганну Сяргееўну Кароўкіну. Доўгажыхар Чыгуначнага раёна падзялілася, што яе дзеці, унукі і праўнукі, якія шмат чаго змаглі дасягнуць у жыцці, — сапраўдная радасць і гонар.

Яшчэ адным адрасатам дабрачыннай акцыі стаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксей Аляксандравіч Галавацкі. Ён быў кулямётчыкам у партызанскім атрадзе, пасля ў складзе І Беларускага фронту дайшоў да Берліна. Актыўны ўдзельнік урокаў памяці, у мінулым годзе ветэран далучыўся да маладзёжнага праекта БРСМ «Галасы памяці».

— Мы віншуем адзінокіх пажылых людзей, ветэранаў вайны і працы, заслужаных жыхароў рэгіёна штогод, але цяпер гэта справа набыла новы імпульс. Гэтыя людзі перадалі нам у спадчыну квітнеючую краіну, мірнае неба і працягваюць выхоўваць моладзь. Самае малое, што мы можам для іх зрабіць, — парадаваць увагай. І гэта вельмі каштоўнае для іх. Мы стараемся заўсёды быць з імі на сувязі. Нехта з іх не можа рухацца самастойна, але яны застаюцца прыкладам сілы і мужнасці, на якія нам, моладзі, трэба арыентавацца, — выказала агульны пасыл моладзі Гомельшчыны **першы сакратар абкама БРСМ Юлія ЛІПОЎСКАЯ.**

Не засталіся ўбаку ад марафону дабра лідары прафсаюзных арганізацый і дэпутацкіх карпусоў у раёнах. У Гомельскім раёне дабрачынную акцыю для пажылых людзей «Ад усёй душы» падтрымалі старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса Леглік і старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька. Яны адрасавалі самыя цёплыя словы ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Надзеі Шэінай з вёскі Міхалькі. Адрасамі акцыі сталі таксама сельскія людзі працы — старажылы населеных пунктаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ПОВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

**Пажылыя людзі цэняць не столькі матэрыяльную дапамогу, колькі ўвагу і клопат. У Мінскай вобласці гэта добра разумеюць і імкнуцца талакой падтрымаць людзей паважанага ўзросту.**

Найлепшыя пачуцці, шчырасць, спагаду да састарэлых праявілі ўдзельнікі рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Ад усёй душы».

— Усяго было ахоплена 13 тысяч чалавек, у тым ліку сем тысяч тых, хто абслугоўваецца дома, чатыры тысячы — у дамах-інтэрнатах, — расказала **намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Надзея ЦУПА.** — Асаблівая ўвага — ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, адзінокім пажылым, доўгажыхарам. Не забыліся і пра тых, хто святкаваў знамянальныя для іх падзеі. Напрыклад, круглую дату з нагоды шлюбу, атрымання высокай дзяржаўнай узнагароды.

Валанцёры, моладзь дапамагалі на падворках і ў хатах. Працавалі яны разам з сацыяльнымі работнікамі. Наведалі падапечных хоспісаў, аддзяленняў дзённага знаходжання сацыяльных устаноў, бальніц сястрынскага догляду. Ладзілі для іх канцэрты, уручалі сувеніры, віншавальныя адкрыткі. Як прызнаваліся пажылыя людзі, ім важна ўвага і магчымасць зносін.

— Вельмі добра, што пасля традыцыйнай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» прайшла акцыя «Ад усёй душы», якая паказала повязь і пераемнасць пакаленняў, — лічыць Надзея Цупа. — Такія цёплыя сустрэчы даюць магчымасць маладым зразумець людзей пажылога ўзросту, зблізіцца з імі духоўна і душэўна.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПАДЗЯКА ЗА ПРАЦУ І МІР

**Нягледзячы на тое, што афіцыйна акцыя завяршылася, марафон добрых спраў на Віцебшчыне працягваецца. Сотні школьнікаў і членаў маладзёжных грамадскіх арганізацый працоўнымі дэсантамі выходзяць на дапамогу людзям «залатога ўзросту».**

У самой жа рэспубліканскай акцыі «Ад усёй душы» актыўна брала ўдзел кіраўніцтва паўночнага рэгіёна, прафсаюзы і прадпрыемствы. Цёплыя словы і пажаданні гучалі ў адрас ветэранаў вайны, людзей пажылога ўзросту з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй і ўсіх, хто сваёй добрасумленнай працай пісаў слаўны летапіс вобласці.



**Малалетні вязень Анатоль ПРУСАКОЎ дае ўрок мужнасці падрастаючаму пакаленню.**

У Шаркаўшчынскім раёне акцыя «Ад усёй душы» стартавала ў Аляксандраўскім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для пажылых і інвалідаў. У госці да жыхароў установы з падарункамі завіталі **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ, старшыня Шаркаўшчынскага райвыканкама Дзмітрый ЛАМАКА** і яго **намеснік Юрый ВАСІЛЕЎСКІ.**

Напярэдадні старога Новага года **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** павіншаваў са святам наведвальнікаў Бычыхінскага філіяла Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гарадка і Гарадоцкага раёна. Ад імя абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» ён падарыў аддзяленню новы тэлевізар.

Словы падзякі за шматгадовую і добрасумленную працу, вялікі ўклад у патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення ад **старшыні Віцебскага гарвыканкама Мікалая АРЛОВА** гучалі ў адрас Ларысы Паўлавай, якая стаяла каля вытокаў музея народнай славы школы № 17 горада Віцебска і кіравала ім 25 гадоў.

«Дзякуй за мірнае неба» — з такім пасылам актывісты Кастрычніцкага райкама БРСМ, вучні і піянеры Віцебскай сярэдняй школы № 29 завіталі ў госці да малалетняга вязня канцлагера «5-ы полк» Анатоля Прусакова. Ён падзяліўся з моладдзю гісторыяй свайго дзяцінства, апаленага вайной, і адзначыў важнасць сувязі пакаленняў, якая не павінна дапусціць горкіх урокаў мінулага.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**

# КАБ СВЕТ СТАЎ ЛЕПШЫ

**На мінулым тыдні дэлегацыя прадстаўнікоў абласной вертыкалі і дэпутацкага корпуса Брэстчыны наведала Брэсцкі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў, які размешчаны ў вёсцы Волкі Брэсцкага раёна.**

Пастаяльцамі гэтай установы з'яўляюцца 128 чалавек ва ўзросце ад 24 да 87 гадоў. Асаблівую ўвагу тут удзяляюць культурна-масавай рабоце. У асяродку жыхароў ёсць і свае таленты. У гэтым змаглі ўпэўніцца госці, калі завіталі на канцэрт у актавую залу. Дзяніс Дзецяроў усе дзесяць гадоў, што жыве ў інтэрнаце, займаецца спевамі. Яго сольныя нумары падчас канцэрта сарвалі шквал апладысментаў. Усе пастаяльцы ў гэты дзень атрымалі прадуктовыя падарункі.

У студзені 1943-га царкву асвяцілі ў памяць пра Казанскі абраз Божай Маці. З блаславення епіскапа Брэсцкага і Кобрынскага Іаана 14 жніўня 2005 года пушчанскі храм атрымаў новае імя. Ён быў названы ў гонар іконы Божай Маці «Ражкоўскай», якая беражліва захоўваецца ў царкве. Праз тры гады на падставе першакрыніцы, некалі падараванай маёрам Хербстам, іканапісцы Аляксандра-Неўскай лаўры ў Пецярбургу стварылі кананічны абраз «Ражкоўская Выратавальніца», які перадалі ў пушчанскае сяло. Нарэшце, летась, напярэдадні 80-годдзя памятнай падзеі, уладыка Іаан здзейсніў вялікае асвячэнне адрамантаванага храма ў Ражкоўцы.

Памяць пра вёску Лескі захоўваецца не толькі ў Хатыні, але і ў мемарыяле, узведзеным на месцы, дзе яна жыла мірным жыццём да ранку 4 мая 1943 года. На помніку, збудаваным да саракагоддзя Вялікай Перамогі, — пералік імёнаў. Гэта тыя, для каго той далёкі вясновы дзень стаў апошнім.

Прозвішчы... прозвішчы...

Брэсцкія, Валошкі, Гімзы, Дзмітрукі, Жукі, Казлы, Кандрацюкі, Літвінчукі, Лябедзічы, Тарасевічы, Цыбулі...

Найменшае дзіця — Саша Жук... Нават не ведаю. Хлопчык? Дзяўчынка? Дзіця мела толькі сем тыдняў ад нараджэння...

Прозвішчы шматразова паўтараюцца. Лёс для іх носьбітаў выпаў аднолькавы... Усяго хроніка «Памяць» Камянецкага раёна гаворыць пра 216 ахвяр, але ў пайменным спісе ў той жа кнізе занатавана толькі 205 чалавек, расстраляных 4 мая. Відаць, яшчэ не ўсе пушчанскія загадкі разгаданы...

**Анатоль БЕНЗЯРУК.**
**Фота з архіва аўтара.**


*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# КАВАЛАЧАК ШЧАСЦЯ

## Чаму зімой узрастае спажыванне шакаладу?

**Сусветны дзень шакаладу адзначаюць у ліпені, таму што прыдумалі гэтае свята ў Францыі. Калі б яго прыдумалі ў Беларусі, то, мабыць, прызначылі б на самыя халодныя і цёмныя дні года — канец студзеня або пачатак лютага. Тое, што ва ўмовах сырой і золкай беларускай зімы значна ўзрастае спажыванне салодкага наогул і шакаладу ў прыватнасці, не сакрэт ні для статыстыкі, ні для гандлю.**

Дарэчы, чаму зімой хочацца шакаладу? Адказ ёсць і ў дыеталагаў, і ў псіхолагаў. Першыя адзначаюць, што сератанін, ён жа «гармон шчасця» (які ўплывае на задаволенасць сабой, навакольнымі і ўвогуле жыццём, а таксама на ўпэўненасць у сваіх сілах) сінтэзуецца ў арганізме пад уздзеяннем сонечнага святла. А без гэтага гармону мы атрымліваем зніжэнне жыццёвага тонусу, беспадстаўна дрэнны настрой і бессань. Дык вось, шакалад змяшчае амінакіслату трыптафан, зыходны матэрыял для ўтварэння сератаніну. А таксама амінакіслату фенілаланін, якая ўдзельнічае ў сінтэзе яшчэ аднаго гармону шчасця — эндарфіну. Такім чынам, 40-50 г шакаладу за дзень забяспечваюць арганізм «зыходным матэрыялам» для таго, каб сінтэзаваць дастаткова гармонаў на суткі добрага настрою.

Псіхолагі, у сваю чаргу, дадаюць: шакалад — не проста дэсерт, прадукт ператварыўся ў сацыякультурны феномен. Дастаткова паглядзець, колькі метафар са словам «шакалад» актыўна выкарыстоўваюць носьбіты любой еўрапейскай мовы. У нашых шыротах, напрыклад, «шакаладная» ў дачыненні да дзяўчыны — значыць загарэлая (або экзатычная), сексуальная і прыгожая; «у шакаладзе» — гаворыцца аб жыццёвым поспеху і матэрыяльным дастатку. У масавай свядомасці шакалад асацыіруецца з маладосцю, хараством і прывабнасцю. А таксама з цяплом роднай хаты, сямейнымі святамі, хатняй выпечкай і адчуваннем абароненасці. Такім чынам, асацыяцыі выключна са знакам плюс, няхай гэта будзе яркасць і вонкавая прывабнасць або ўтульнасць і спакойная радасць.

**Тыя, хто любіць спалучэнне белага і чорнага шакаладу або незвычайныя камбінацыі — гэта, хутчэй за ўсё, мабільныя, актыўныя, няўрымслівыя натуры. У крайняй праяве такія людзі пастаянна знаходзяцца ў пошуку новых уражанняў — ад кулінарных вынаходстваў да змены роду дзейнасці раз на некалькі гадоў і патрэбы ў новых адносінах.**

### ВЫБАР ЁСЦЬ

З прадуктаў харчавання санкцыі ў найбольшай ступені закранулі (разам з некаторымі іншымі) якраз сегмент шакаладу. Асартымент тых аддзелаў гіпермаркетаў, дзе прадаюцца шакалад і шакаладныя цукеркі, зведаў больш за ўсё змен. З паліц сышлі нямецкія «квадрацікі» Ritter Sport, а таксама Merci і Toffifee. Швейцарскі шакаладны брэнд Toblerone таксама застаецца для нашых спажыўцоў пакуль што ўспамінам, як і яго «суайчыннік» Lindt. Тое ж самае датычыцца і шакаладных шарыкаў у залатой паперцы Ferrero Rocher італьянскай вытворчасці. Многія са спажыўцоў гэта заўважылі, а многія і не, таму што «Камунарка» і «Спартак» нікуды не дзеліся, а іх прадукцыя сапраўды карыстаецца ўсенароднай любоўю. Засталіся на паліцах, зразумела, і тыя звыклыя нам шакаладныя прысмакі, якія вырабляюць у Расіі (Milka, «Kinder шакалад» і «народныя» батончыкі Snickers, Nuts і г. д.). Асартымент дапаўняюць шакаладныя вырабы з Турцыі, ААЭ, Казахстана і Сербіі.

Дарэчы, любоў постсавецкага спажыўца да «Камунаркі» і «Спартака», зразумела, — вынік шматгадовай работы над іміджам брэнда і якасцю прадукцыі. Але ёсць у іх і першапачатковая «фора» ў параўнанні з замежнымі канкурэнтамі, адзначаюць псіхолагі.



— Напэўна, многім з нас нескладана згадаць, які менавіта шакалад мы паспыталі першым. Часцей за ўсё такое знаёмства ў прадстаўнікоў славянскіх краін узроставай катэгорыі ад 35 да 60 гадоў і старэйшых пачыналася з «савецкай класікі» («Мішка на паляне», «Чырвоная Шапачка», «Грыльяж», «Алёнка»), — кажа псіхолаг, гештальт-тэрапеўт Кацярына Алёхіна. — Адсюль любоў да брэндаў, якія асацыіруюцца з гэтымі рэцэптурамі, і да вытворцаў, якія да сённяшняга часу такую прадукцыю выпускаюць.

Адсюль жа, дарэчы, і паўсюдная ў постсавецкіх краінах любоў да малочнага шакаладу ў процівагу шакаладу горкаму.

— Савецкія рэцэпты шакаладу заўсёды ўтрымлівалі малако, — кажа псіхолаг. — А малако — прадукт, смак якога кажа падсвядомасці пра бяспеку, абароненасць і прадказальнасць свету (нават калі ў дарослым жыцці само па сабе малако вы не любіце). Паклаўшы кавалачак малочнага шакаладу ў рот, чалавек адчувае пазітыў і заспакаенне: смакавыя рэцэптары даюць падсвядомасці сігнал, што мы абароненыя.

Зразумела, сёння і «Камунарка», і «Спартак» выпускаюць шырокі асартымент шакаладу — і малочнага, і горкага. І, дарэчы, прыхільнасць да таго ці іншага віду шакаладу можа многае расказаць пра чалавека. Пачнём з аматараў горкага шакаладу. Пра тых, хто сапраўды любіць чорны шакалад, можна сказаць, што яны давяраюць свайму густу, не схільныя падпарадкоўвацца чужому ўплыву, добра ведаюць свае жаданні і імкненні і маюць смеласць прытрымлівацца іх, мяркуе псіхолаг. Ёсць і іншыя — тыя, хто ўжывае «вытанчаны» горкі шакалад, хоць на самай справе любіць «народны» малочны (рэч у тым, што горкі шакалад рэклама і грамадская думка пазіцыянуюць як ласунак для людзей, што сочаць за вагой, а таксама як любімы дэсерт артыстычных, шляхетных натур). Людзям, што ядуць горкі шакалад, а мараць пра малочны, складана рабіць выбар, яны часта хістаюцца ў сваіх меркаваннях і не заўсёды ў стане адказаць на пытанне, што ім сапраўды падабаецца. А тыя, хто любіць спалучэнне белага і чорнага шакаладу або незвычайныя камбінацыі (накшталт шакалад з салёнай начынкай) — гэта, хутчэй за ўсё, мабільныя, актыўныя, няўрымслівыя натуры. У крайняй праяве такія людзі пастаянна знаходзяцца ў пошуку новых уражанняў — ад кулінарных вынаходстваў да змены роду дзейнасці раз на некалькі гадоў і патрэбы ў новых адносінах (без гэтага яны сумуюць). Зразумела, такі «псіхааналіз» нельга назваць дакладным, але... мабыць, нешта ў гэтым ёсць?

Дарэчы, менавіта асацыятыўны рад, звязаны з шакаладам, выкарыстоўваюць салоны прыгажосці, прапануючы шакаладныя абгортванні і маскі для твару (традыцыйна цікавасць да іх узрастае ў халады, хоць прапануюцца яны круглы год). Аснова шакаладных абгортванняў — какавыя зярняты і какава-алей, якія змагаюцца з цэлюлітам, даюць эфект ліфтынгу, сілкуюць і амаладжваюць скуру. Але гаворка не толькі аб рэальнай



карысці. Падсвядома жанчына адчувае ўпэўненасць, што пасля такой б'юці-працэдуры яе жыццё стане «саладзейшым» — больш шчаслівым і паспяховым.

### РАМАН З «АЛЁНКАЙ»

А раз гэты ласунак — не проста дэсерт, а адзін з культурных кодаў чалавецтва, то спатканне з патэнцыяльным кандыдатам у мужы (або кандыдаткай у жонкі) цалкам разумна прызначыць у кавярні, дзе падаюць шакаладныя дэсерты, жартам (ці ўсур'ёз?) раіць псіхолаг.

— Да ведама мужчын. Калі жанчына актыўна і з непадробным жахам адмаўляецца ад салодкага («Я наогул не ем шакаладу (варыянт: салодкага), гэта прычына і лішняй вагі, і карыесу!»), цалкам магчыма, яна — уладальніца «жорсткага суперэга» (гэта значыць, жыве ў пастаянным ціску на саму сябе). Дамы з жорсткім суперэга будуюць жыццё ў адпаведнасці з самастойна створанай сістэмай табу і прадпісанняў. І калі вашы адносіны стануць сур'ёзнымі, жорсткія табу і прадпісанні распаўсюдзяцца і на вас: яны будуць датычыцца ўсіх сфер жыцця, у тым ліку побыту і інтыму, — распавядае Кацярына Алёхіна.

А вось рашэнне азнаёміцца з усім асартыментам прапанаваных дэсертаў («Паглядзім, што тут прапануюць») — як раз добры знак: ён ці яна здольныя рабіць выбар, а гэта, безумоўна, рыса сталага чалавека.

Інфармацыю пра тое, што чалавек — аматар пэўнай маркі шакаладу і заўсёды выбірае толькі яе, можна расцэньваць па-рознаму, адзначае суразмоўніца. Са знакам плюс або мінус, залежыць ад таго, як вы ўспрымаеце пастаянства і кансерватыўнасць: як вернасць або сумнае занудства.

— Дапусцім, чалавек любіць «Любимую Алёнку» ад «Камунаркі», і з дзяцінства выбірае толькі яе. Што ж, можна зрабіць выснову, што такі чалавек будзе верным мужам. У яго наўрад ці ўзнікне жаданне здраджваць сваёй выбранніцы, і калі ён спыніць выбар на вас, то будзе кахаць у розных «фанціках» (нягледзячы на ўзрост, набраную вагу або няўдалую прычоску). Шмат каму ён падасца сумным, але менавіта кансерватыўнасць — рыса надзейных мужоў (і добрых жонак). Калі вы здолееце запаліць яго каханне, яно не памеркне з гадамі, — кажа псіхолаг.

Што павінна вас насцярожыць? Агрэсіўная маніпулятыўнасць. Калі чалавек абясцэньвае ваша меркаванне: у дачыненні да шакаладу — напрыклад, настойвае, што «малочны любяць дзеці, дарослыя выбіраюць горкі». Ці, напрыклад, чытае вам лекцыю пра «шкоду ўсіх гэтых транстлушчаў у дэсертах» і настойвае, што «не трэба табе ўсяго гэтага».

**Шакалад у масавай свядомасці асацыіруецца з маладосцю, прыгажосцю і прывабнасцю. А таксама з цяплом роднай хаты, сямейнымі святамі, хатняй выпечкай і пачуццём абароненасці.**

— Гэта ўжо не пра шакалад. Гэта пра дамінаванне і жаданне падпарадкоўваць. Калі чалавек ужо на першым спатканні ведае, «што для вас правільна» — з ім лепш не звязвацца, незалежна ад таго, аддае перавагу ён шакаладу або вэнджанай каўбасе. Шчаслівыя адносіны можна пабудаваць толькі з тым ці з той, хто дазваляе сабе і вам выбіраць і атрымліваць асалоду ад жыцця.

А калі мужчына звяртаецца да жанчыны «мая салодкая», «мая цукерачка»?

— Я сказала б, гэта абясцэньванне асобы жанчыны. Хоць многія расцэньваюць гэта як камплімент, на самай справе тут варта задумацца, як такі мужчына ставіцца да вас, у прыватнасці, і да жанчын наогул. Не выключана, што сапраўды, як да цукерак: «з'есці і забыцца». Я б задумалася аб вернасці і надзейнасці такога чалавека і, верагодна, аб яго меркаваным няўменні ладзіць доўгачасовыя сур'ёзныя адносіны, якія прадугледжваюць узаемную адказнасць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Тэхналогіі будучыні

# БЕСПІЛОТНЫ... ЛЕДАКОЛ

## Ён сам прааналізуе характарыстыкі арктычных умоў

**Навукоўцы з Ніжагародскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Р. Я. Аляксеева знайшлі спосаб запусціць у эксплуатацыю беспілотны ледакол. Гэта стане магчымым дзякуючы сістэме кіравання сілавой энергетычнай устаноўкай судна ў Арктыцы, паведамляе выданне «СеверПост».**

Сістэма, створаная навукоўцамі, уяўляе з сябе бартавы камп'ютар з уманціраваным аналага-лічбавым пераўтваральнікам і датчыкамі кінематычных параметраў руху для аналізу характарыстык лядовых умоў. Гэтыя датчыкі вызначаюць траекторыю, па якой рухаецца судна, яго хуткасць, а таксама час і месца, у якія адбываецца рух ледакола.



«Наша распрацоўка павялічвае хуткасць руху ледаколаў, дазваляе эканоміць паліва да 19 працэнтаў і ў перспектыве ўключыць у сябе беспілотнае суднавaджэнне», — падсумаваў выкладчык кафедры «Караблебудаванне і авіяцыйная тэхніка» Андрэй Себін.

Пласты гісторыі

# З КАРОНАЙ НА ГАЛАВЕ

## Выяўлена старажытная скульптура правіцеля



**Пры раскопках у старажытным горадзе Шымаа ў кітайскай правінцыі Шэньсі археолагі знайшлі двухметровую скульптурную выяву мужчыны з каронай на галаве. Скульптура аказалася самай буйной з шэрага іншых каменных фігур паблізу. Навукоўцы мяркуюць, што гэта партрэт правіцеля Шымаа, перадае партал news.artnet.**

Гэтую і іншыя скульптуры выявілі летам мінулага года каля падножжа піраміды, якая ўзвышалася ў цэнтры горада. Мерказваны ўзрост скульптуры — 4300 гадоў, што робіць яе адной з самых старажытных падобных знаходак.

Руіны Шымаа былі знойдзены на ўсходзе Кітая ў 1976 годзе і да апошняга часу лічыліся рэшткамі невялікага паселішча эпохі неаліту. Але ў 2018 годзе падчас раскопак у тым месцы ўдалося адшукаць горад плошчай каля чатырох квадратных кіламетраў, абнесены крапаснымі сценамі і равамі, запоўненымі чалавечымі чарапамі (мяркуецца, што там практыкаваліся ахвярапрынашэнні). У цэнтры горада ўзвышалася піраміда вышынёй 70 метраў, увянчаная вялізным палацам з вадасховішчам.

Начная фея

# ВЯСЁЛЫЯ РЫТМЫ

## Яны дапамагаюць дзецям хутчэй засынаць

**Шатландскія навукоўцы з Універсітэта Дандзі падчас даследаванняў прыйшлі да высновы, што хуткая і вясёлая музыка прымушае немаўлят засынаць хутчэй, чым павольная. Даследаванне апублікаваў часопіс Psychological Studies.**

Вынікі былі атрыманы падчас эксперыменту, у якім узялі ўдзел сем'і з сотняй дзяцей ва ўзросце да тыдня. Навукоўцы прасачылі, наколькі хутка малыя пераходзілі ад дрымоты да сну ў цішыні, а таксама калі ім уключалі павольную ці вясёлую музыку.

Як адзначаецца ў публікацыі, вучоныя высветлілі, што немаўляты пад музыку засынаюць хутчэй, чым у поўнай цішыні. Рытмічная і вясёлая музыка аказвала самы дабратворны ўплыў на іх — пад яе яны засыналі лепш за ўсё.

Таксама даследчыкі заўважылі, што пад музыку немаўляты часцей заплюшчваюць вочы. Удакладняецца, што ў будучыні навукоўцы маюць намер працягваць вывучаць уплыў музыкі на дзяцей і іх рэакцыю на яе.



Вось у чым справа!

# ЛАПЫ ДЛЯ СНЕГУ

## Белыя мядзведзі ходзяць на шыпаваных падушачках

**На шчыльным, зляжалым снезе лёгка паслізнуцца. А менавіта па такім ходзяць белыя мядзведзі, але чамусьці не паслізгваюцца. Даследчыкі з Універсітэта Акрона пішуць у Journal of the Royal Society Interface, што ўся справа ў адмысловым будынку падушачак на мядзведжых лапах.**

Наогул, падушачкі ў белых мядзведзяў маленькія, менш, чым у іншых, што і зразумела: на падушачках шэрсць не расце, без яе яны лёгка губляюць цяпло, а ў арктычных шыротах цеплакстраты трэба па максімуме скарачаць. Пры гэтым, калі паглядзець на лапу пад мікраскопам, відаць, што падушачкі абсыпаны выступамі.

Такія выступы ёсць ва ўсіх мядзведзяў, акрамя малайскага, але ў белага яны самыя доўгія. Яны іграюць ролю шыпоў, якія не даюць мядзведзю слізгаць. Даследчыкі нават зрабілі з дапамогай 3D-прынтара мадэль гэтых мікравыступаў, каб выпрабаваць іх на снезе, і аказалася, што ў белых мядзведзяў яны сапраўды павінны лепш чапляцца за снег — у 1,3-1,5 раза, чым у іншых відаў.



Біялогія з анатоміяй

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫ БАЛАНС НА ДОНЦЫ

## Рэкамендацыя выпіваць восем шклянак вады на дзень — памылковая

**Галоўнае, што паказвае гэта даследаванне, — тое, што распаўсюджанае ўяўленне аб норме ў восем шклянак вады на дзень, напэўна, для большасці людзей завышана. Навукоўцы з Універсітэта Абердзіна ў Шатландыі высветлілі, што рэкамендаваная норма ў два літры вады за дзень можа быць залішняя. Шатландскія вучоныя адзначаюць, што прыкладна палову дзённай нормы вадкасці чалавек прымае з ежай, таму піць так шмат чыстай вады неабавязкова. Цяпер на аснове маштабнага даследавання яны раяць піць па 1,5-1,8 літра на дзень.**

Прафесар Джон Спікмен, адзін з аўтараў даследавання, сказаў: «Першапачатковае вымярэнне дзённай патрэбы ў два літры — гэта вынік невялікай памылкі. Вада, якую мы павінны піць, — розніца паміж агульнай дзённай патрэбай і тым, што мы атрымліваем з ежай».

Вадкасць, атрыманую з ёй, вымяралі, пытаючыся ў людзей, колькі тыя ядуць. Аднак рэспандэнты, як правіла, гавораць, што ядуць менш, чым у рэальнасці, і таму ў разліку памылка, а колькасць вады, якую трэба піць, пераацэньваецца», — растлумачыў Спікмен.



Аднак у новым даследаванні абарот вады ў чалавечым целе ўдалося палічыць больш дакладна з дапамогай тэхналогіі, у якой прымяняюцца стабільныя ізатопы.

У даследаванні ўзялі ўдзел 5604 чалавекі з 23 краін ва ўзросце ад васьмі дзён да 96 гадоў. Удзельнікі падчас эксперыменту выпівалі шклянку вады, у якой некаторыя з малекул вадароду былі заменены на стабільны ізатоп дэйтэрый. Ён выпрацоўваецца ў целе чалавека і абсалютна бясшкодны.

Па хуткасці, з якой дэйтэрый выходзіў затым з арганізма ўдзельнікаў даследавання, замыралі хуткасць абароту вады ў іх целе. Гэтая хуткасць ва ўсіх людзей розная, таму дакладная дзённая норма вады свая ў кожнага чалавека. Напрыклад, вада ў целе хутчэй абнаўляецца ў тых, хто жыве ў спякотным і вільготным клімаце, у высакагор'і, а таксама ў спартсменаў, цяжарных і кормячых жанчын.

Самы важны фактар, які вызначае хуткасць абароту вады ў целе, — гэта колькасць выдаткаванай энергіі. Найвышэйшы ён у мужчын ва ўзросце 20—35 гадоў: за дзень з іх цела выходзіць у сярэднім 4,2 літра вады. З узростам гэты аб'ём падае і ў мужчын да 90 гадоў апускаецца прыкладна да 2,5 літра. У выпадку жанчын ва ўзросце 20—40 гадоў гаворка ідзе пра 3,3 літра вады за дзень, а да 90 гадоў і ў іх дзённы аб'ём вадкасці, што выходзіць з цела, падае да 2,5 літра.

Аднак калі ваш арганізм за дзень страчвае 4,2 літра вады, гэта не значыць, што вам трэба выпіць такую ж колькасць, адзначыў прафесар Спікмен. «Фактычна піць трэба будзе 3,6 літра, бо большую частку неабходнай нам вады мы атрымліваем падчас ежы», — сказаў ён.

Галоўнае, што паказвае гэтае даследаванне, — тое, што распаўсюджанае ўяўленне аб норме ў восем шклянак вады за дзень, мусіць, для большасці людзей завышанае. «Нашы даныя не пацвярджаюць магчымасці аднаго стандарту для ўсіх людзей», — адзначае навуковец.

Паводле яго слоў, залішняе спажыванне вады можа быць і шкодным. Але не столькі для здароўя, колькі для экалогіі. «Чыстая пітная вада не бясплатная», — адзначыў Спікмен.

«Калі людзі ў сярэднім будуць піць на літр больш, чым ім трэба, памножце гэта на 40 мільёнаў дарослых брытанцаў, і атрымаецца, што мы без патрэбы выпіваем, а затым і выпускаем у выглядзе мачы, то атрымаецца 20 мільёнаў літраў. Гэта не праходзіць бясследна», — растлумачыў ён.

Дык колькі трэба выпіваць вады за дзень? Прынята лічыць, што здароваму даросламу чалавеку патрабуецца каля 35 мілілітраў вады за дзень на кілаграм масы цела — у адпаведнасці з агульнымі рэкамендацыямі навуковых арганізацый. Для чалавека вагой 50 кілаграмаў неабходна 1,7 літра, 60 кілаграмаў — 2,1 літра, 70 кілаграмаў — 2,4 літра, 80 кілаграмаў — 2,8 літра вады кожны дзень.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# САКРЭТЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## Іх раскрывае энцыклапедычнае выданне «Гарады і вёскі Беларусі»

**СЕМЕЖАЎСКІЯ цары, быхаўскія саламяныя павукі, мотальскі вясельны каравай, дрыбінскія шапавалы, пагарынскія гарадкі, сакуны са Старых Дарог, вільчынскія паляне... Усё гэта лакальныя сімвалы Беларусі. Так, яна перастала асацыявацца толькі з дранікамі ды зубрамі. Праз фестывалі, падарожжы, знаёмствы мы адкрываем наноў сваю краіну. З загадкавымі куточкамі, багатай гісторыяй, непадобнымі адзін да другога гарадамі, вёскамі, дзе яшчэ расказваюць паданні і казкі, пачутыя ў маленстве, і майстрамі, якія ўласнымі рукамі ствараюць далікатныя рэчы. Усе гэтыя адметнасці кладуцца на новыя турыстычныя маршруты, фестывалі, музейныя экспазіцыі.**

Але б ці мелі мы сёння такую пазнавальную мазаіку па гісторыі і культуры нашай краіны, калі б не праца вучоных? Падчас экспедыцый, канферэнцый, выдавецкай дзейнасці яны не толькі збіралі, асэнсоўвалі багаты матэрыял, але і падтрымлівалі носьбітаў традыцый, даносілі, наколькі важна захаваць гэтыя элементы народнай культуры ў кожным рэгіёне, абуджалі цікавасць да спадчыны. Адной з работ, якая дапамагае пазнаваць краіну, знаходзіць новыя факты, стала энцыклапедычнае выданне «Гарады і вёскі Беларусі». У 20-томніку змяшчаецца інфармацыя пра больш чым 20 тысяч паселішчаў! У навуковым выданні можна знайсці звесткі пра малыя і вялікія гарады, пасёлкі гарадскога тыпу, вёскі і хутары. Інфармацыю пра іх вучоныя шукалі ў экспедыцыях, камандзіроўках, архівах.

Гэты ўнёсак у захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны ацэнены на самым высокім узроўні: калектыў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук адзначаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне».

— Работа над 20-томным выданнем «Гарады і вёскі Беларусі» вялася каля 40 гадоў, — заўважае **дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр ЛАКОТКА.** — Інфармацыя падаецца ў энцыклапедыі па абласцях, раёнах, сельскіх саветах. Карацей, структура, якой зручна карыстацца як жыхарам і кіраўнікам пэўных населеных пунктаў, так і турыстам. У кнігах пададзена больш за 24 тысячы даведак па хутарах, вёсках, мястэчках, малых і вялікіх гарадах. Прыводзіцца інфармацыя па гісторыі паселішчаў, па іх ландшафтна-тэрытарыяльных рысах, а таксама па дарогах, якія вядуць туды і адтуль. Тут можна знайсці звесткі пра знакамітых людзей: Героях Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, мастакоў, вучоных, артыстаў, пісьменнікаў. Увогуле, тых мясцовых людзей, якімі ганарыцца родная вёска ці родны край. У шматтомніку прыводзіцца інфармацыя пра мастацкія асаблівасці рэгіёна, традыцыйныя рамёствы і промыслы, помнікі архітэктуры, сядзібна-паркавага мастацтва. Апісаны ўвесь культурны комплекс, які складаецца з прыродных і рукатворных стварэнняў. У даведках інфармацыя падаецца храналагічна.

Работа стала магчымай дзякуючы шматгадовым пошукам як у экспедыцыях, так і ў архівах — не толькі нацыянальных, абласных, статыстычных даных абл- і райвыканкамаў, але і ў фондах, архівах, бібліятэках Санкт-Пецярбурга і Масквы, Расійскага этнаграфічнага музея, шматлікіх крыніцах з архіваў Вільні, Варшавы, Львова, Кіева. Вельмі карыснымі для гэтага даследавання былі такія работы, як Акты Віленскай археаграфічнай камісіі яшчэ часоў Расійскай імперыі (другая палова XIX — пачатак XX стагоддзя). Адтуль выбраны звесткі аб першапачатковай згадцы многіх паселішчаў. Выкарыстаны такія крыніцы, як апісанне губерняў Беларусі афіцэрамі генеральнага штаба. Па Магілёўскай губерні сам губернатар Дамбавецкі, вядомы дзеяч беларускай культуры і адукацыі, напісаў кнігу. Віцебскую губерню апісаў гісторык Сапуноў. Усе гэтыя крыніцы далі ўнікальны навуковы матэрыял, які згадваецца ўпершыню.

***— Як узнікла ідэя аб стварэнні шматтомніка?***

— Задумка гэтага выдання не была спантаннай, нечаканай ці эксклюзіўнай. У пасляваенны час на ўзлёце пачуцця патрыятызму ў выніку перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, пачуцця народнага адзінства як у нацыянальным, так і ў саюзным маштабе, стала зразумела, што настала пара сапраўднага вывучэння культуры народаў і нацый СССР. Так выйшла 47 тамоў беларускай народнай творчасці, дзе знайшла сваё адлюстраванне ўся духоўная культура. Пабачыў свет «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», у якім знаходзіцца інфармацыя пра помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва, а таксама пра помнікі пераможцам і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. 16 тысяч артыкулаў прысвечана археалогіі. Доўгі час «Збор помнікаў гісторыі і культуры» з'яўляўся навуковай крыніцай для ўключэння помнікаў у Дзяржаўны спіс нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. На аснове гэтай працы і папярэдніх даследаванняў і ўзнікла ідэя стварэння такой энцыклапедыі. Гэта былі праекты саюзнага маштабу. Атрымалася, што толькі Беларусь выдала «Збор помнікаў гісторыі і культуры». Такі ж лёс і ў энцыклапедычнага выдання «Гарады і вёскі». Задума падобнага твору таксама была саюзнага маштабу. Да распаду Савецкага Саюза Расійская акадэмія навук планавала таксама выдаць шматтомнікі «Народы и культуры», і мы паспелі выдаць том, прысвечаны беларусам. Многія задумы не здзейсніліся, бо распалася дзяржава і перастала існаваць такая гістарычная супольнасць, як савецкі народ.

***— Праца вучоных запатрабаваная пры стварэнні новых маршрутаў? Усё ж турыст не паедзе некалькі разоў глядзець адно і тое ж месца.***



— Унікальнай з'явай для Беларусі з'яўляецца тое, што прамысловая рэвалюцыя царскіх часоў, мадэрнізацыя моцна не адбілася на традыцыйнай спадчыне. На нашай тэрыторыі воляй лёсу захавалася многа цэнтраў традыцыйных рамёстваў, промыслаў, народныя мастацкія калектывы адраджаюць святы, традыцыйныя абрады. І гэту спадчыну цяпер трэба шырока папулярызаваць, захоўваць, ствараць магчымасці для трансляцыі. Я хацеў бы адзначыць, што пры ўручэнні Прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецпрэмій Прэзідэнта гэтым разам адзначаны менавіта цэнтры аўтэнтычнай народнай культуры: кераміка Копысі, дрыбінскія шапавалы, традыцыйная культура Тонежа, унікальнага мястэчка на захадзе Лельчыцкага раёна. У Год міру і стваральнай дзейнасці такі вынік вельмі актуальны і знакавы. Менавіта падтрымка гэтых на самай справе ўражвальных цэнтраў і забеспячэнне іх спадчыннасці — актуальная і сур'ёзная задача. Трэба, пачынаючы з дзіцячых садкоў і школ, у тых месцах, дзе захаваліся цэнтры, выхоўваць транслятараў спадчыннасці, прадаўжальнікаў. Другога шляху няма. Астатняе — гэта тэатр. Сумна глядзець, калі на традыцыйных святах замест аўтэнтычных рэчаў падаюцца прыдуманыя сёння. Але ж у вёсках яшчэ многа чаго захавалася, штосьці можна адрадзіць. Прэзідэнт у свой час ініцыяваў адраджэнне ўнікальнай мастацкай традыцыі па вырабе слуцкіх паясоў. Былі распрацаваны навуковыя абгрунтаванні: і мастацкія, і тэхналагічныя. Створана і набыта ўнікальнае ткацкае абсталяванне. Аналагаў фабрыкі ў Слуцку няма. Турысты праз шкло могуць паглядзець, як ткуцца слуцкія паясы. Выпускаецца вялікі асартымент разнастайных сувеніраў — ад тых, што ідуць на падарункі прэзідэнтам іншых краін, якія наведваюць Беларусь, да прадукцыі для турыстаў.

***— Ці можна сказаць, што культура — выдатны падмурак для патрыятычнага выхавання?***

— Так было са старажытных часоў. Напрыклад, у ранніх славян курганы продкаў нагадвалі нашчадкам пра спадчыннасць. Помнікі юрыдычна замацоўвалі правы жыць на гэтай зямлі. Гэта карані патрыятызму. Сёння спадчына — і вясковая, і гарадская, і сямейнабытавая — таксама з'яўляецца крыніцай патрыятызму. Пачуццё гонару грунтуецца найперш на сямейнай спадчыннасці. Раней заходзіш у хату — і бачыш, што ўся сценка завешана фотаздымкамі бацькоў, дзядоў, прадзедаў, унукаў. Такія сувязі не выкараніш. На святы сваякі вяртаюцца ў бацькоўскі край. Прыязджаюць сыны, дочкі, унукі — гэта цэлая піраміда, замацаваная за пэўным месцам.



**«Работа над 20-томным выданнем «Гарады і вёскі Беларусі» вялася каля 40 гадоў. Праца стала магчымай дзякуючы шматгадовым пошукам як у экспедыцыях, так і ў архівах — не толькі нацыянальных, абласных, статыстычных даных абл- і райвыканкамаў, але і ў фондах, архівах, бібліятэках Санкт-Пецярбурга і Масквы, Расійскага этнаграфічнага музея, шматлікіх крыніцах з архіваў Вільні, Варшавы, Львова, Кіева. Вельмі карыснымі для гэтага даследавання былі такія работы, як Акты Віленскай археаграфічнай камісіі яшчэ часоў Расійскай імперыі (другая палова XIX — пачатак XX стагоддзя)».**

***— Напэўна, у гэтым залог эканамічнай бяспекі? Чалавек, прывязаны да сваёй зямлі, будзе думаць не пра тое, куды з'ехаць, а што зрабіць, каб на радзіме стала лепш...***

— Ёсць родная хата, двор, вёска, на якой жывуць тутэйшыя. І ёсць павага да цябе як нашчадка, як пераемніка гэтай спадчыны, як гаспадара. Менавіта тут крыецца эканамічная бяспека. Гэта раней у горад ехалі па кватэры з ваннымі пакоямі. Цяпер у вёсцы, аграгарадках, аграсядзібах тыя ж самыя ўмовы, што і ў сталіцы. Дадайце сюды выдатную сетку добраўпарадкаваных дарог. І чалавек сёння можа выбіраць, дзе яму будзе больш камфортна жыць. Сучасныя маладыя людзі мараць ужо не пра кватэру, а пра ўласны дом.

***— У зборніку ёсць інфармацыя пра вёскі, якія ўжо не існуюць. Ці будзе яна карысная для людзей, якія цікавяцца сваімі каранямі?***

— Змены адбываюцца ўвесь час. Так ва ўсім свеце. Да сярэдзіны 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў Беларусі налічвалася 34 тысячы сельскіх паселенняў. Да моманту напісання 20-томніка засталося 24 тысячы. Ёсць цяжкія наступствы вайны, але і само жыццё на тыя працэсы ўплывала. Можна згадаць савецкія праграмы неперспектыўных вёсак, узбуйненне вясковых паселенняў. Ствараліся калгасы-мільённікі. Але сёння мы выйшлі на ўзровень сучаснага развіцця вёскі, і працэс разбурэння спыніўся. Вёска стала камфортнай, арганічна эканамічна і сацыяльна ўпісалася ў адзіную інфраструктуру рассялення. Знік перакос у бок горада.

***— Ці можна сказаць, што шматтомнік «Гарады і вёскі» — тая крыніца, якая падштурхне да пошуку новых сімвалаў, у тым ліку мясцовых, звязаных з пэўнымі раёнамі, вёскамі?***

— І сёння, і ў будучыні сімвалы будуць абапірацца на мясцовую ўнікальнасць. Яны могуць быць самымі нечаканымі. Напрыклад, ёсць маса вёсак, у якіх маюцца месцы, што лічацца святымі. Там можа быць камень незвычайнай формы, пра які распавядаюць пэўную легенду. Ёсць сімвалы, якімі ганарацца, ушаноўваюць, звязаныя як з гераічнымі, так і трагічнымі старонкамі гісторыі. Ёсць сімвалы, пераважна ў Заходняй Беларусі, звязаныя з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі перадзеламі. У ваколіцах Мірскага замка захаваўся шэраг хутарскіх вёсак. Ідзе прасёлачная дарога, і ад яе праз жытнёвае поле вядуць сцежкі да асобных сядзіб. Ёсць сімвалы, звязаныя з гастраноміяй. Многія такія цікавінкі можна знайсці ў кнізе «Маршруты беларускага турызму». На месцах можна сабраць гісторыі і пра сцежкі, і пра старыя дрэвы, што растуць асобна. Я прапаноўваў прадстаўнікам Міністэрства транспарту на аўтазапраўках размяшчаць указальнікі пра тое, якія аб'екты побач знаходзяцца. Гэта можа быць тысячагадовы дуб, старажытная сядзіба, прыдарожны крыж ці мясціны, якія апісалі пісьменнікі, намалявалі мастакі. Пошук такой інфармацыі павінен быць пастаянным. Даследчык не можа адначасова паспець усюды, і добра, калі ва ўсіх людзей ёсць разуменне, што падобная інфармацыя цікавая і каштоўная. Напрыклад, я размаўляю з тапографамі і геадэзістамі. Яны часам даведваюцца пра пэўныя мясцовыя асаблівасці, назвы. А колькі б маглі распавесці леснікі! Згадайце сям'ю Якуба Коласа, бацька якога быў леснікам. У кожным раёне ёсць тыя, хто ўсё гэта збірае — краязнаўцы, настаўнікі мовы, літаратуры, гісторыі, мясцовыя музеі, бібліятэкі. Трэба толькі больш пра тое гаварыць.

**Ганна ПЯТРОВА.**

# За ўмацаванне дружбы паміж народамі

**Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі ўзнагародзіў пісьменніка, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава ордэнам Дружбы**

**Вядомы ў Беларусі і за яе межамі філакартыст, краязнаўца, публіцыст Уладзімір Ліхадзедаў на працягу многіх гадоў прапагандуе айчынную гісторыю, даследуе повязі Беларусі з суседнімі краінамі. І выкарыстоўвае пры гэтым дакументальныя ілюстрацыйныя матэрыялы. Найперш — старыя паштоўкі. Як правіла, у сваіх публікацыях, пералік якіх даўно перавышае не адну тысячу выступленняў у друку (а яшчэ ж — і некалькі дзясяткаў кніг, філакартычных альбомаў), даследчык карыстаецца ўласным зборам.**



Высокую ўзнагароду Уладзіміру ЛІХАДЗЕДАВУ уручылі ў МЗС Беларусі.

Пачатак выступленням у друку ў свой час былі пакладзены публікацыямі на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня». Па выніках гісторыка-публіцыстычнай і асветніцкай дзейнасці ў 2006 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ліхадзедаў быў адзначаны Прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Публікацыі пра розныя адрасы, розныя паселішчы Беларусі ў спалучэнні з ілюстраваннем іх «ліхадзедаўскімі» паштоўкамі пачалі з'яўляцца на старонках газет «Голас Радзімы», «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Беларусь», «Маладосць», іншых перыядычных выданняў. Разам з рэдакцыямі, з якімі супрацоўнічаў, найперш — газеты «Советская Белоруссия», а следам і Выдавецкага дома «Беларусь сегодня», Уладзімір Аляксеевіч арганізаваў мноства мерапрыемстваў. Чытачам цікава было даведацца, як збіралася калекцыя, якія таямніцы яна яшчэ дазволіць адкрыць.

Многія цікаўныя да гісторыі жыхары нашай краіны пачалі збіраць выразкі публікацый з рэпрадукцыямі паштовак. А ў выдавецтве «Літаратура і мастацтва» выйшла кніга «У пошуках страчанага» (па назве газетнага праекта, звязанага з паштоўкамі), дзе былі прадстаўлены розныя рэгіёны краіны — праз краязнаўчы тэкст і праз выявы розных мясцін. Следам з'явілася кніга «Знічкі Айчыны» — зборнік нарысаў пра гарады і мястэчкі Беларусі, пра тое, з якімі адрасамі злучаны ўраджэнцы Беларусі, што пакінулі ў навуцы, культуры, народнай гаспадарцы іншых краін свету значны след.

Уладзімір Аляксеевіч выяўляе сябе грандыёзным прыдумшчыкам, уважлівым угледжальнікам у мінуўшчыну. Адзін за другім у розных выдавецтвах пабачылі свет альбомы калекцыянера, якія праз паштоўкі дапамагалі праліць святло на шматканфесійнае жыццё на беларускіх землях, на тыя ці іншыя з'явы, падзеі ў гісторыі Беларусі. За плённую працу былі і высокія адзнакі. Праект «Знічкі Айчыны» быў заўважаны Беларускім саюзам журналістаў, які адзначыў публіцыста аўтарытэтнай прэміяй БСЖ «Залатое пяро».

Адна за другой у розных установах адукацыі, культуры па ўсёй Беларусі пачалі з'яўляцца выстаўкі з рэпрадукцыямі старых паштовак з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правёў шэраг выставак, а таксама паспрыяў арганізацыі міжнародных канферэнцый па філакартыі, выкарыстоўванні яе ў справе вывучэння гісторыі і ў патрыятычным выхаванні грамадства. Цяпер многія ініцыятывы калекцыянер рэалізоўвае супольна з Нацыянальным музеем гісторыі Беларусі. У яго сценах праводзяцца адмысловыя філакартычныя выстаўкі. Варта заўважыць, што следам альбо нават у пярэдадзень іх выдаюцца грунтоўныя каталогі. Шмат для падтрымкі і ў кніжным прасоўванні ідэй калекцыянера, і ў частцы яго памкненняў па выставачнай дзейнасці робіцца Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Праект, які цяпер носіць назву «Бацькаўшчына», прэзентуецца на самых розных асветніцкіх, культурных пляцоўках краіны. Найперш — у розных гарадах у час правядзення Дзён беларускага пісьменства.

— Гэта, дарэчы, — заўважае **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ**, — дазваляе выкарыстоўваць старую паштоўку, іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы са збораў Уладзіміра Ліхадзедава, як аргументы, як крыніцы інфармацыі ў арганізацыі ідэалагічнай, выхаваўчай працы. У памяці і тое, як літаральна «прагучалі» па ўсёй Беларусі старыя газеты ў першае святкаванне Дня народнага адзінства. Уладзімір Аляксеевіч сабраў старыя заходнебеларускія і савецкія газеты, якія красамоўна расказалі пра верасень 1939 года, пра ўз'яднанне нашага беларускага народа — і на выстаўках, і праз факсімільнае выкананне на старонках сучасных перыядычных выданняў. Ліхадзедаў — выдатны генератар асветніцкіх ідэй, сапраўдны патрыёт сваёй радзімы.

Шматлікія ініцыятывы беларускага калекцыянера заўважаны ў Расійскай Федэрацыі. Пра яго часта пісаў маскоўскі друк — і «Литературная газета», і спецыяльныя перыядычныя выданні калекцыянераў. Уладзімір Ліхадзедаў адзначаны грамадскай узнагародай — знакам «За вялікі ўклад у калекцыйную справу Расіі». У свой час розгалас меў двухтомны філакартычны альбом нашага суайчынніка «Банкі Расійскай імперыі». Неаднойчы ў сваіх кнігах калекцыянер звяртаўся да гісторыі Першай сусветнай вайны. А апошнім часам асаблівае гучанне набылі выстаўка старых паштовак (многія з іх — з ліставання з жыхарамі Ленінграда ў горкія блакадныя дні) і адмысловы альбом (выдадзены ў Выдавецкім доме «Звязда») «Блакада»... І для расіян, і для беларусаў сэнс гэтага слова адкрывае мужнасць, трагедыйнасць, якая спадарожнічала жыццю нашых прашчураў у гады ваеннага ліхалецця. Пра «блакадны» праект у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, значнасць гэтай працы, яе ролю ў выхаванні грамадства гаварыў губернатар Санкт-Пецярбурга Аляксандр БЯГЛОЎ на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі ў лютым 2022 года.

...А днямі беларускаму калекцыянеру, члену Беларускага саюза журналістаў, члену Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміру Аляксеевічу Ліхадзедаву ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргей Лаўроў уручыў ордэн Дружбы. Як адзначана ва Указе Уладзіміра ПУЦІНА: «...За заслугі ва ўмацаванні дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі...» Віншуем Уладзіміра Ліхадзедава і жадаем яго памкненням распавядаць пра гісторыю развівацца і надалей!..

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Спадчына

# Як прайсці ў каралеўскую лазню?

**У Старым замку Гродна для наведвальнікаў сталі даступныя тры новыя інтэр'ерныя залы XVI стагоддзя**



**Пасля рэканструкцыі свае дзверы адчыніла «Капліца», «Каралеўская лазня» і «Пакоі чыноўніка». На чарзе — адкрыццё самай велічнай у замку «Алебастравай залы». Праект рэканструкцыі даволі аб'ёмны, разлічаны на тры чаргі. Інтэр'ерныя залы — завяршэнне першай. Музейныя экспазіцыі ў шасці залах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея адкрыты ў Старым замку год таму. Тут прадстаўлена гісторыя будаўніцтва замка, жыццё старога горада, эпоха караля Стэфана Баторыя і іншыя тэмы.**

У новых залах акцэнт робіцца менавіта на інтэр'еры — столь, падлогу, мэблю, абсталяванне. Пры рэканструкцыі спецыялісты «Белрэстаўрацыі» ўлічвалі мноства гістарычных і мастацкіх нюансаў. Напрыклад, у капліцы вокны ўпрыгожваюць яркія каляровыя вітражы, вышэй, у нішах, размешчана дванаццаць маляўнічых карцін, якія расказваюць аб жыцці святога Стэфана. Магчыма, у яго гонар і была асвячона капліца замка караля Стэфана Баторыя. Тут праходзілі каралеўскія месы. Увесь інтэр'ер — копія рэчаў, якія былі тут раней. Звяртае на сябе ўвагу так званы паставец, ці камода, рэч антыкварная, XVIII стагоддзя. А вось аналой — навадзел, хоць і адпавядае форме тых часоў.

Адным з самых унікальных элементаў гэтага памяшкання можна лічыць фрэскавы роспіс з раслінным арнаментам, які захаваўся з XVI стагоддзя. Ён быў знойдзены падчас работ пад некалькімі пластамі тынкоўкі.

Яшчэ адным упрыгожваннем капліцы з'яўляецца ўнікальная печ. Дарэчы, у Старым замку шэсць розных печаў. **Дырэктар музея Юрый КІТУРКА** звяртае ўвагу на печ у пакоі каралеўскага сакратара. На сёння выдзелена прыкладна 40 набораў печаў, якія існавалі на тэрыторыі ВКЛ у Сярэднявеччы. У Беларусі яны добра вывучаны, і калі знаходзіцца падчас раскопак невялікі адбітак старажытнай кафлі,



гэта значыць, што тут і была такая печ. Падчас рэстаўрацыі да яе падбіраліся адпаведная кафля. Такім чынам, печ у пакоі атрымалася ўнікальная, партрэтная, з выявамі вядомых людзей старажытнасці.

У каралеўскай лазні стаяць вялікія драўляныя балеі. Кажуць, што каралі тых часоў вельмі любілі лазневыя працэдуры, некаторыя прымалі іх штодзённа. Сцены ў лазні дэкарыраваны драўлянымі дубовымі панэлямі з раслінным арнаментам. Інтэр'еры новых залаў максімальна наблізаны да тых, якія былі пры праўленні Стэфана Баторыя.

Як расказаў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК,** аднаўленне замка вядзецца ў рамках дзяржаўнай і абласной інвестыцыйных праграм. На гэтыя мэты накіравана 34 мільёны рублёў, трэцяя частка гэтых сродкаў асвоена ў мінулым годзе.

Цікавасць да замка пастаянна расце. За два першыя месяцы пасля адкрыцця экспазіцыі яе наведалі 12 тысяч чалавек, а за такі ж перыяд 2022 года колькасць наведвальнікаў вырасла больш чым у 10 разоў і дасягнула 140 тысяч.

— Стары замак з'яўляецца прыкладам захавання гістарычнай спадчыны Беларусі, — падкрэсліў Віктар Пранюк. — Работы па аднаўленні пачаліся ў 2017 годзе, а да гэтага была праведзена вялікая даследчая работа па вывучэнні гістарычных матэрыялаў. Інстытут «Грамадзянпраект» у праектаванні выкарыстаў самыя сучасныя тэхналогіі. Гэта 3D-сканіраванне, глыбокае свідраванне, захаванне ўсіх артэфактаў, якія знаходзяцца ў Замкавай гары. Прыменены сучасныя тэхналогіі, каб не разбурыць тое, што ёсць, і аднавіць інтэр'ер Старога замка.

Як падкрэсліў **намеснік міністра культуры Беларусі Сяргей САРАКАЧ,** вядзецца работа па падрыхтоўцы да рэалізацыі другой чаргі рэканструкцыі Старога замка. Гэта самы складаны этап работ, куды ўваходзіць аднаўленне каралеўскага палаца і флігеля. Цяпер вядуцца праектныя работы. Сучасная рэканструкцыя павінна вярнуць Старому замку тое велічнае аблічча, якое ў свой час задумаў Стэфан Баторый.

Важна адзначыць, што рэканструкцыя Старога замка — адзін з шэрагу маштабных праектаў па захаванні і аднаўленні гістарычнай спадчыны. Сёння для наведвальнікаў даступныя адноўленыя Мірскі, Нясвіжскі, Лідскі замкі. Вядуцца работы па рэканструкцыі Гальшанскага, Крэўскага і Навагрудскага замкаў. У найбліжэйшы час рыхтуецца да адкрыцця Жыліцкі палацава-паркавы комплекс у Магілёўскай вобласці, дзе таксама завяршаюцца рэстаўрацыйныя работы.

— Вялікая ўвага аднаўленню нашых гістарычных помнікаў удзяляецца з боку кіраўніцтва краіны, значную падтрымку мы атрымліваем з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва. У мінулым годзе на аднаўленне пяці аб'ектаў было выдзелена тры мільёны рублёў. Сярод аб'ектаў — унікальны храм XV стагоддзя ў неагатычным стылі ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна. На рэканструкцыю накіравана 500 тысяч рублёў. Аб'ект рыхтуецца да ўключэння ў спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА, — зазначыў Сяргей Саракач.

Як адзначалася падчас урачыстага адкрыцця чарговага пускавога комплексу, новыя інтэр'еры — гэта невялікая частка той работы, якая праведзена і вядзецца надалей. У найбліжэйшыя месяцы для наведвальнікаў будзе даступна раскошная «Алебастравая зала». Кажуць, што гэта будзе самы велічны пакой ва ўсім замку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

БЕЛАРУСБАНК

## ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ)

**на изменение порядка уменьшения ставки дохода по вкладу в связи с изменением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 11,5 % годовых**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает, что снижение ставки дохода, указанной в договоре банковского вклада (депозита), в связи со снижением с 23.01.2023 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 11,5 % годовых (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 18.01.2023 № 19) осуществляется с 24.02.2023 по следующим банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- срочный банковский вклад «Жилищно-накопительный» (проценты по вкладам, открытым по 28.10.2018 (включительно));

- банковский целевой вклад «Попечение» (проценты по вкладам, открытым по 31.01.2016 (включительно)).

Установленный порядок применяется к вышеуказанным банковским вкладам (депозитам) в случае, если по ним по состоянию на 24.02.2023 не начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу не начисляется в размере ставки вклада до востребования.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком в полном объеме процентов по вкладу за период с 23.01.2023 до даты изменения процентов по вкладу – 24.02.2023.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте belarusbank.by и в отделениях Беларусбанка**

Сохранность и возврат вкладов гарантируются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

В производстве **суда Московского района г. Минска** находится гражданское дело по заявлению Андрончик Веры Александровны, проживающей по адресу: г. Минск, ул. Есенина, 25/2-70, о восстановлении прав по документам на предъявителя, а именно чеков «Жилье»: серия IIIБI номер 0916405 номиналом 100 рублей, серия IIAI номер 0359357 номиналом 50 рублей, серия IГI номер 0252175 номиналом 10 рублей, серия IГI номер 0252176 номиналом 10 рублей, серия IГI номер 0252177 номиналом 10 рублей, серия IГI номер 0252178 номиналом 10 рублей в ОАО «Беларусбанк».

Предлагаем держателю указанных документов, об утрате которых заявлено, в трехмесячный срок со дня опубликования объявления подать в суд Московского района г. Минска (220116, г. Минск, пр. Правды, дом 27, кабинет 220) заявление о своих правах на эти документы.

## Извещение о проведении **10 февраля 2023 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-10565, общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 3 936,00 | 393,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564, общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 4 512,00 | 451,00 |
